LIMITEDMINSK: ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ БРЭНДА

ЧЫРВОНКА

ВАЖАТЫ — КУРАТАР «ДЫНАСТЫІ»

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЖНІЎНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 151 (28767)

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ, намеснік міністра фінансаў:

«Праект бюджэту на 2019 год фарміраваўся зыходзячы з базавага сцэнарыя эканамічнага развіцця. Асноўныя параметры: інфляцыя — 5 %, стаўка рэфінансавання — 9,75 %. Кошт нафты — $60 за барэль. Пры планаванні бюджэту ўлічана рэалізацыя падатковага манеўру ў Расіі. Чакаецца, што рост даходаў па кансалідаваным бюджэце складзе менш за 1 %, па рэспубліканскім — 98,3 % да ацэнкі бягучага года. Прыярытэтнымі напрамкамі фінансавання ў 2019 годзе будуць выдаткі на павышэнне заработнай платы ў бюджэтнай сферы і выкананне даўгавых абавязацельстваў».

КАРАТКА

• У Кобрынскім раёне экіпаж старшага камбайнера Юрыя Сідарука і памочніка Вадзіма Леўчука (ААТ «Пакроўскі») першым у Брэсцкай вобласці стаў двухтысячнікам, намалаціўшы 2040 тон збожжа.

• **Сярэдні заробак у 2019 годзе прагназуецца на ўзроўні BYN1025.**

• У Мінску з пачатку года ўведзены ў эксплуатацыю 34 жылыя дамы, да канца года плануецца здаць яшчэ 38 дамоў.

• **На смеццеперапрацоўчым заводзе пад Гродна пры сартаванні смецця знайшлі газавы рэвальвер Reck Agent.**

• Больш за 147 тысяч бляшанак няякасных мясных кансерваў пахавалі па ўказанні службовых асоб буйнога мясакамбіната ў Мінскай вобласці.

ISSN 1990 - 763X

18151

9 771990 763008

ЖНІВЕНЬ У СТАЛІЦЫ АЛЬМАНСКІХ БАЛОТ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пачатак восьмага месяца года ў столінскіх Альманах выдаўся шчодрым на сонечнае надвор'е, і таму жніўныя палі своечасова былі абмалочаныя, ураджай вывезены на такі. Здаецца, яшчэ ўчора стаяла залатая сцяна збажыны, а сёння на Гачы — былым балотным альманскім урочышчы — толькі калючая пожня. На ўскрайку поля мне пашэнціла сустрэць бесклапотных вясковых дзяцей — дзесяцігадовага Юрыя ЯЎСОВІЧА і яго чатырохгадовую суседку Ксенію ЗАВЯЛАВУ, якія вярталіся дадому. Дарэчы, клопат у малых папраўдзе таксама быў: на полі малеча засвойвала першыя ўрокі хлебаробскай працы.

СТАР. 13

■ Прэм'ера рубрыкі

«ПРАЧЫТАЎ — ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ»

У дзень свайго 101-годдзя «Звязда» распачынае праект, прысвечаны падпольным і партызанскім газетам

Кожны год 9 жніўня, у чарговыя ўгодкі нашай любімай газеты, мы на яе старонках абавязкова штосьці прыгадваем са слаўнай багатай гісторыі «Звязды», якой усе пакаленні рэдакцыі небеспадстаўна ганарацца. У гэты дзень не згадаць пра ваеннае мінулае выдання проста немагчыма: «Звязда» — газета-падпольшчыца, газета-партызанка, якая ў тыле ворага, падчас самай глыбокай акупацыі нашай зямлі давала людзям надзею і веру, што фашысцкая навала згіне, словам клікала на змаганне за свабоду роднага краю. Сталыя чытачы нашай газеты пра яе ваенную гісторыю ведаюць бадай што ўсё.

У такім самавітым узросце — 101 год — ужо не хочацца паўтарацца. З пазіцыі найстарэйшай газеты краіны можна зірнуць на беларускае друкаванае слова ваенных гадоў у іншым ракурсе, а менавіта — расказаць пра іншыя падпольныя і партызанскія газеты, якія выходзілі на акупаванай фашыстамі тэрыторыі. За кожным асобнікам такіх выданняў стаіць звычайны чалавечы подзвіг, такі самы, як подзвіг «звяздоўцаў», якія штохвіліны рызыкуючы жыццём, пісалі матэрыялы, набіралі гранкі, рабілі адбіткі, распаўсюджвалі аддрукаванае...

СТАР. 4

■ Рэканструкцыя

«Нам засталася спадчына...»

У Ваўкавыскім раёне аднаўляюць сядзібу са шляхецкім размахам

Пасля 20-гадовага запусцення вядуцца работы ў старажытным маёнтку ў Падароску. Тут з'явіцца першы ў краіне музей беларускай шляхты, а панскія пакоі пераўтворацца ў гасцінічныя нумары.

СТАР. 15

У такім выглядзе маёнтак дайшоў да нашых дзён.

ДЫЯЛОГ З МОЛАДДЗЮ ПРА МОЛАДЗЬ

адбыўся падчас рэспубліканскага семінара-практыкума на Гомельшчыне

Новыя формы ўзаемадзеяння ўлады і моладзі на працягу двух дзён абмяркоўвалі каля 350 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і ведамстваў, абласной і раённай вертыкалі, грамадскіх арганізацый, дэпутацкага корпуса з усіх абласцей краіны.

У першы дзень удзельнікі рэспубліканскага семінара-практыкума «Удасканаленне дзейнасці ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь» наведалі Лоеў і Рэчыцкі раён, у другі — плённа працавалі ў Рэчыцы. Дэлегаты азнаёміліся з работай установ адукацыі і культуры, прадпрыемстваў рэгіёна. На кожным з аб'ектаў гасцям імкнуліся паказаць нестандартныя формы работы з моладдзю.

Рэспубліканская тэматычная выстаўка, размешчаная ў палацы культуры «Нафтавік», задала тон гутарцы пра сапраўдныя праблемы, якія хвалююць тых, хто зараз працуе з моладдзю. **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА** падкрэсліла, што актуальныя пытанні былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы:

— Важна выканаць даручэнні, якія былі агучаны на V Усебеларускім народным сходзе, Рэспубліканскім педагагічным савеце, іншых мерапрыемствах і нарадах, дзе былі дадзены канкрэтныя даручэнні па рабоце з моладдзю. Без сумнення, гэта абмен вопытам. Шмат пытанняў, якія хвалююць усіх, хто сёння працуе з моладдзю, у тым ліку дзяржаўныя органы кіравання. Мы сабраліся, каб у працэсе абмену меркаваннямі ўдакладніць, што яшчэ трэба зрабіць, магчыма, на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, зусім нядаўна падчас апошняга з'езда БРСМ былі агучаны прапановы па павелічэнні маладзёжнага ўзросту: не 31 год, а крыху болей, бо сёння зусім іншая працягласць жыцця. Напэўна, ёсць і некаторыя іншыя пытанні: прафесійная арыентацыя старшакласнікаў, атрыманне адукацыі і працаўладкаванне, работа па патрыятычным выхаванні моладзі.

Міністр адукацыі Беларусі Ігар КАРПЕНКА адзначыў, што сёння нельга працаваць з моладдзю толькі інтуітыўна. Павінны быць навуковы і практычны падыходы. Кіраўнік ведамства расказаў, што ў краіне распрацоўць стратэгію развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі да 2030 года.

Фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы маладога чалавека — сярод стратэгічных кірункаў. Дарэчы, у новым навучальным годзе прапануецца рэалізаваць праект «Школа актыўнага грамадзяніна» ва ўстановах адукацыі. Ён дапаможа сфарміраваць сацыяльна актыўнага грамадзяніна. Другі кірунак — удасканаленне прафарыентацыйнай работы. Для навучэнцаў 10 класаў уводзіцца прадмет «Працоўнае навучанне». Па словах міністра адукацыі, неабходна арыентавацца на падрыхтоўку кадраў для высокатэхналагічных вытворчасцяў, павышэнне прэстыжу рабочых прафесій. Не менш важная падтрымка таленавітай моладзі. Сярод прыярытэтаў — стварэнне ўмоў для эфектыўнага прафесійнага станаўлення і развіцця моладзі, падтрымка маладых прадпрымальнікаў, арганізацыя другаснай занятасці. Асобную ўвагу ўдзеляць дзіцячым і маладзёжным грамадскім аб'яднанням і прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў сярод маладых людзей, а таксама фізкультуры і аздараўленню. Не менш важнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі.

Рэгіянальны інавацыйны досвед па пытаннях работы з моладдзю стане матэрыялам для аналізу і абмеркавання ў рамках усёй краіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ІВАН ДУКЕ ЎСТУПІЎ НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА КАЛУМБІІ

Цырымонія інаўгурацыі адбылася на плошчы Балівара ў Багаце — цэнтральнай плошчы краіны. Усяго на ёй прысутнічалі кіраўнікі 10 дзяржаў і дэлегацыі яшчэ 17 краін. Дуке разам з жонкай і трыма дзецьмі пешшу прыйшоў на плошчу па прылеглай вуліцы ў суправаджэнні аркестра і аховы. Пасля выканання дзяржаўнага гімна ён прынёс прысягу прэзідэнта Калумбіі, пасля чаго надзеў прэзідэнцкую стужку і стаў новым кіраўніком дзяржавы. Па выніках выбараў кандыдат ад правых сіл 42-гадовы Іван Дуке набраў амаль 54 працэнты галасоў выбаршчыкаў. Ён стаў самым маладым прэзідэнтам Калумбіі за апошнія 70 гадоў, прычым толькі на адзін чатырохгадовы тэрмін без права перавыбрання, якое было адменена ў 2015 годзе пры яго папярэдніку Хуане Мануэлі Сантасе. Дуке пайшоў на выбары ад партыі «Дэмакратычны цэнтр», лідар якой экс-прэзідэнт Альвара Урыбе лічыцца заўзятым праціўнікам дасягнутых раней мірных пагадненняў з паўстанцкай арганізацыяй Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі (РУСК). Сам Дуке ўжо заявіў, што не мае намеру разрываць мірныя дагаворы з РУСК.

У ЛІВІІ ПАПРАСІЛІ ПУЦІНА АСАБІСТА ЎМЯШАЦЦА ВА ЎРЭГУЛЯВАННЕ КРЫЗІСУ Ў КРАІНЕ

Вырашэнне лівійскага крызісу патрабуе ўмяшання з боку Расіі і асабіста яе прэзідэнта Уладзіміра Пуціна. Пра гэта ў інтэрв'ю РІА «Навіны» заявіў афіцыйны прадстаўнік Лівійскай нацыянальнай арміі (ЛНА) брыгадны генерал Ахмед аль-Місмары. Камандаванне ЛНА мае рэгулярныя кантакты з МЗС і Мінабароны Расіі. Маршал Халіфа Хафтар неаднаразова за апошнія некалькі гадоў наведваў Маскву для сустрэч з кіраўнікамі расійскага МЗС і Мінабароны, а таксама з сакратаром Савета бяспекі. У Лівіі цяпер пануе двоеўладдзе: на ўсходзе краіны ў горадзе Табрук засядае абраны народам парламент, а на захадзе ў сталіцы Трыпалі кіруе сфарміраваны пры падтрымцы ААН і Еўропы ўрад нацыянальнай згоды на чале з Фаезам ас-Сараджам. Усходнія ўлады краіны дзейнічаюць незалежна ад Трыпалі і супрацоўнічаюць з нацыянальнай арміяй на чале з маршалам Халіфой Хафтарам, якая вядзе зацяжную вайну з ісламістамі. Падтрымку Хафтару за межамі Лівіі аказваюць Егіпет і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Таксама ён падтрымлівае цесныя сувязі з Масквой. У пачатку студзеня 2017 года маршал Хафтар падняўся на борт авіяносца «Адмірал Кузняцоў», які ў той час вяртаўся з Сірыі, дзе выконваў баявыя задачы. Там ён узяў удзел у відэаканферэнцыі з міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу. Па даных СМІ, па выніках гэтых перагавораў Расія пагадзілася паставіць маршалу зброю на суму два мільярды долараў.

ЭКС-ПРЭМ'ЕРУ МАЛАЙЗІІ ПАГРАЖАЕ 45 ГАДОЎ ТУРМЫ

Суд Малайзіі прад'явіў абвінавачанні экс-прэм'еру краіны Наджыбу Разаку ў парушэнні закона аб барацьбе з адмываннем грошай і фінансаванні тэрарызму, а таксама атрыманні даходаў ад незаконнай дзейнасці і растраце больш як 10 мільёнаў долараў з дзяржаўнага фонду SRC International. Гэтыя сродкі былі пераведзеныя на асабістыя рахункі Разака. Акрамя таго, судовая калегія задаволіла патрабаванне дзяржаўнага абвінаваўцы перадаць справу ў Вярхоўны суд. Былы прэм'ер заявіў аб сваёй невінаватасці. Як паведамляецца, Разаку пагражае да 45 гадоў пазбаўлення волі ў выпадку вынясення яму абвінаваўчага прысуду па трох эпізодах крымінальнай справы. Гэта ўжо другое з'яўленне былога кіраўніка ўрада Малайзіі ў судзе за апошні час. На пачатку ліпеня ён быў затрыманы праваахоўнымі органамі ў сувязі з абвінавачаннямі ў злоўжыванні ўладай. Аднак суд задаволіў хадайніцтва абароны і выпусціў экс-прэм'ера пад заклад.

■ Высокія тэхналогіі

Дзіцячыя хірургі плануюць дапамагаць малым яшчэ да іх нараджэння

За сем месяцаў бягучага года ў РНПЦ дзіцячай хірургіі паступілі 10 пацыентаў з апёкамі стрававода і 130 малых з іншароднымі прадметамі ў арганізме. У 2017 годзе такіх пацыентаў было 18 і 326 адпаведна.

Як расказаў **дырэктар цэнтра, галоўны пазаштатны дзіцячы кардыяхірург Міністэрства аховы здароўя Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ,** колькасць дзяцей, якія церпяць ад апёкаў стрававода, нягледзячы на ўсе папярэджанні і прафілактычную работу, не змяншаецца апошнія 5—10 гадоў. Прычым у 95 працэнтах выпадкаў віна за гэтыя здарэнні кладзецца на бацькоў. Выпадак у Горках, дзе аднагадовае дзіця атрымала хімічныя апёкі поласці рота і стрававода, абсалютна тыповы. Менавіта дарослыя пералілі вадкасць для ачышчэння каналізацыйных труб з наяўнасцю кіслаты ў пластыкавую бутэльку з-пад газіраванага напітку. Калі бацькі выкарыстоўваюць для захоўвання агрэсіўных вадкасцяў звычайную тару, прычым не вельмі клапоцяцца пра тое, каб у дзіцяці не было да яе доступу, гэта, як правіла, заканчваецца трагічна.

— Прыблізна 80 працэнтаў дзяцей, якія паступаюць да нас, — малыя ад года да 2,5 года, — расказвае **загадчык аддзялення экстраннай хірургіі РНПЦ дзіцячай хірургіі Ігар СЯЎКОЎСКІ.** — Гэта менавіта той узрост, калі дзіця спасцігае свет, каштуе рэчы на смак і цягне ў рот усё, што яму трапляецца...

А вось колькасць дзяцей, якія праглынулі іншародныя прадметы, у гэтым годзе зменшылася прыкладна на 20—30 працэнтаў. Пасля з'яўлення ў абароце манет менавіта гэты прадмет часцей за ўсё вымушаны былі даставаць з дзіцячых арганізмаў хірургі. Вось і сёлета было 78 такіх выпадкаў. А ў 18 выпадках хірургам давялося выратоўваць дзяцей, якія праглынулі батарэйкі. На шчасце, абышлося без трагічных зыходаў. Таксама дзеці глыталі дробныя дэталі цацак, запінкі, завушніцы... Усе іншародныя прадметы, якія не маглі выйсці натуральным шляхам, выдаляліся з дапамогай эндаскапічнай тэхнікі.

Асобна Канстанцін Драздоўскі спыніўся на дасягненнях дзіцячай хірургіі. З канца 2017 года было праведзена ўжо каля 20 аперацый па лячэнні парушэнняў рытму сэрца ў дзяцей ва ўзросце 5—6 гадоў. Раней пацыенты з такой паталогіяй аперыраваліся толькі ва ўзросце 15—17 гадоў, а да гэтага іх падтрымлівалі медыкаментознай тэрапіяй.

«У мінулым годзе паступіла спецыяльнае абсталяванне і мы пачалі рабіць першыя аперацыі ў дзяцей з пяці гадоў. Гэта значыць, што яны не будуць 10 гадоў чакаць, прымаючы сур'ёзныя прэпараты, а ўжо ў дашкольным узросце атрымаюць неабходную дапамогу. Такія дзеці змогуць жыць паўнавартасным жыццём, вучыцца, займацца спортам, танцаваць... У год патрабуецца ад 80 да 100 такіх аперацый. Цяпер мы кожны тыдзень выконваем іх як мінімум дзве-тры, а то і чатыры. Гэта адзін з сур'ёзных прарыўных момантаў у нашай рабоце!».

Таксама беларускія дзіцячыя хірургі першымі на постсавецкай прасторы займелі найноўшы бронхаскапічны комплекс, які дазваляе рабіць бронхаскапію дзеткам з вагой цела ад аднаго кілаграма. З імклівым развіццём рэпрадуктыўных тэхналогій у краіне ўсё часцей сталі нараджацца дзеці з невялікай масай цела і праблемамі прыроджанага характару. Найноўшы бронхаскоп мае дыяметр усяго 1,8 міліметра і дазваляе дыягнаставаць і лячыць паталогіі трахеі і бронхаў у дзяцей, якія важаць усяго кілаграм!

А некалькі месяцаў таму беларускія дзіцячыя кардыяхірургі ўпершыню ў краіне здзейснілі аперацыю па замене клапана лёгачнай артэрыі праскурным доступам праз прасвет сасуда. Першым пацыентам, якому правялі такое ўмяшанне, стаў 12-гадовы хлопчык са складаным прыроджаным парокам сэрца.

— Дзеці з такой паталогіяй да 10—12 гадоў пераносяць ужо па тры-чатыры складаныя аперацыі. Яны суправаджаюцца разрэзам грудной клеткі, спыненнем сэрца пацыента і яго падключэннем да апарата штучнага кровазвароту. Аперацыя складаная тэхнічна, дастаткова траўматычная і спалучаная з высокай рызыкай для пацыента. Дзеці растуць, і пратэзы трэба рэгулярна замяняць. А цяпер мы змаглі даставіць клапан у лёгачную артэрыю эндаваскулярным спосабам, — растлумачыў Канстанцін Драздоўскі.

Яшчэ адзін вельмі перспектыўны навуковы праект спецыялісты РНПЦ дзіцячай хірургіі збіраюцца рэалізоўваць разам з РНПЦ «Маці і дзіця» (зараз ён праходзіць узгадненне і экспертызу). Яго мэта — дапамагчы дзецям з прыроджанай грыжай дыяфрагмы яшчэ да іх нараджэння (у перыяд цяжарнасці маці). Гэта вельмі цяжкая паталогія, і больш як 50 працэнтаў такіх дзетак гінуць пасля нараджэння.

Усяго ў РНПЦ дзіцячай хірургіі выконваецца за год каля пяці тысяч аперацый, з іх 1100—1200 робяцца на сэрцы.

— Аб'ёмы экспарту беларускіх медыцынскіх паслуг у дзіцячай хірургіі складаюць 120—140 тысяч долараў у год. Геаграфія экспарту — бліжняе замежжа: Расія, Украіна, ёсць пацыенты з Малдовы і Казахстана, — расказаў Канстанцін Драздоўскі. — Некалькі месяцаў таму каманда з трох чалавек удзельнічала ў выстаўцы ва Узбекістане. Беларускія спецыялісты арганізавалі ў рамках форуму скрынінг прыроджаных парокаў сэрца. На кансультацыю актыўна прыходзілі дзеці з бацькамі, і, як вынік, — першы пацыент з Узбекістана ўжо прааперыраваны ў РНПЦ дзіцячай хірургіі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Добрая сувязь як кампанент іміджу краіны

Цягнікі беларускай чыгункі аснасцяць унікальным тэхнічным рашэннем да Еўрапейскіх гульняў

Афіцыйны аператар сувязі Еўрапейскіх гульняў кампанія velcom і Беларуская чыгунка (БЧ) ў рамках падрыхтоўкі да мультыспартыўнага форуму прадставілі ўнікальнае для Беларусі тэхнічнае рашэнне сувязі для пасажырскіх цягнікоў. Новая распрацоўка дазваляе адначасова забяспечыць пасажыраў бясплатным інтэрнэт-доступам па тэхналогіі Wi-Fi і ўстойлівай мабільнай 3G-сувязі пры любой хуткасці руху цягніка.

Цяпер такое рашэнне запушчана ў адным электрацягніку рэгіянальных ліній бізнес-класа, а да пачатку II Еўрапейскіх гульняў будзе разгорнута яшчэ ў 17 цягніках. Уздоўж чыгуначнага палатна будзе таксама пабудавана каля 100 новых базавых станцый на асноўных чыгуначных магістралях: Гомель — Гудагай і Брэст — Орша. Пакрыццё мабільнай сувяззю будзе істотна палепшана і на памежных пераходах, і на інфраструктурных аб'ектах: трэніровачных базах, гасцініцах і іншых лакацыях. «Усё гэта робіцца для таго, каб госці і ўдзельнікі Гульняў былі забяспечаны звышвыразнай галасавой сувяззю і ўстойлівым інтэрнэт-злучэннем незалежна ад месца свайго знаходжання», — адзначае **начальнік аддзела планавання радыёсеткі кампаніі velcom Аляксей КАРНІЦКІ.**

Ва ўсіх вагонах цягнікоў будуць устаноўлены пункты доступу Wi-Fi, якія падключаныя да маршрутызатара з бесправадным мадэмам. Узмацняльнае абсталяванне рэтранслюе атрыманы ад базавых станцый сігнал 3G-сеткі праз пракладзены ў вагонах кабель. А для паляпшэння прыёму сігналу як сістэмы Wi-Fi, так і ўзмацняльнікаў сігналу выкарыстоўваюцца спецыяльныя антэны, устаноўленыя на даху цягніка. Тэхнічная распрацоўка дазваляе забяспечыць устойлівую мабільную сувязь у цягніках, нягледзячы на металічныя сценкі вагонаў, якія дрэнна прапускаюць сігнал, высокую хуткасць руху цягнікоў і аддаленасць ад базавых станцый.

Важна, што скарыстацца Wi-Fi, знаходзячыся ў дарозе, змогуць бясплатна абаненты ўсіх мабільных аператараў. Для гэтага пасажырам неабходна будзе прайсці рэгістрацыю праз партал аўтарызацыі, а пасля — атрымаць код доступу з дапамогай sms на свой нумар мабільнага тэлефона.

Адзначым, што за мінулы месяц ужо каля пяці тысяч пасажыраў рэгіянальных ліній скарысталіся Wi-Fi у дарозе.

Для рэалізацыі згаданага праекта Беларуская чыгунка выдзеліла тэлекам-аператару ўчасткі для ўстаноўкі вышак сотавай сувязі, а таксама забяспечыла доступ да тэхналагічнага электрасілкавання. «Доступ да бесправаднога інтэрнэту ў цягніках і якаснай сувязі з'яўляюцца важным складнікам сэрвісу для пасажыраў нароўні з бяспекай, камфортам і скарачэннем часу ў дарозе, — адзначае **намеснік начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі Аляксандр СЫРЦОЎ.** — Акрамя таго, павышэнне якасці сувязі дазволіць аптымізаваць спадарожныя тэхналогіі і сэрвісы БЧ, забяспечыўшы ўстойлівую работу прылад кантролю пасадкі пасажыраў, продаж білетаў праз інтэрнэт і безнаяўныя разлікі ў цягніках».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ У дарозе

НЕ СПІ — ЗАГІНЕШ

...У аварыі, якая адбылася раніцай 7 жніўня на 277-м кіламетры трасы М1, адзін чалавек загінуў, яшчэ два атрымалі траўмы. Прычына аварыі — шафёр адарваўся ад кіравання аўтамашынай (як мяркуецца, заснуў). У аварыі, што здарылася ў гэты ж дзень у 14.00 у Мастоўскім раёне, адзін чалавек загінуў, яшчэ двое атрымалі сур'ёзныя траўмы. Кіроўца больш як суткі знаходзіўся за рулём, у выніку чаго заснуў. Загінула яго 19-гадовая дачка.

У Рагачоўскім раёне мікрааўтобус заехаў на сустрэчную паласу і ўрэзаўся ў грузавік. Гэтая аварыя, у якой загінуў кіроўца мікрааўтобуса, хутчэй за ўсё, была выклікана той жа банальнай і сумнай прычынай: чалавек заснуў за рулём.

У нядаўняй жудаснай аварыі мікрааўтобус з гомельскімі турыстамі, які рухаўся па маршруце Адэса—Гомель, урэзаўся ў грузавік у Мікалаеўскай вобласці. Загінулі пяць чалавек, у тым ліку дырэктар фірмы-перавозчыка. Яшчэ дванаццаць чалавек з цялеснымі пашкоджаннямі рознай ступені цяжкасці дастаўленыя ў бальніцу...

Навіны як быццам з поля бою. Кожны дзень мы атрымліваем весткі пра чарговую аварыю з гібеллю кіроўцаў і пасажыраў. Нярэдкія выпадкі, калі ў ДТЗ трапляюць аўтобусы, якія перавозяць не адзін дзясятак людзей. Прычыны розныя, але ўсім добра вядомыя: парушэнне кіроўцам рэжыму працы і адпачынку, непаладкі з транспартным сродкам, перавышэнне хуткаснага рэжыму, парушэнні правілаў дарожнага руху. Як зрабіць так, каб выкараніць або радыкальна мінімізаваць колькасць парушэнняў і гарантаваць бяспеку грамадзян на дарогах?

Па словах **Сяргея ГЛЯМБОЎСКАГА, намесніка начальніка ўпраўлення кантролю аўтамабільнага транспарту Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый,** ажыццяўляецца жорсткі кантроль за станам транспартных сродкаў, у прыватнасці аўтобусаў міжнародных напрамкаў. Яны правяраюцца ў кантрольна-прапускных пунктах на ўездзе ў нашу краіну. І, як паказвае практыка, у кожным чацвёртым аўтобусе выяўляюцца пэўныя «хібы»: няспраўнасць тэхнічнай часткі альбо парушэнне кіроўцам рэжыму працы і адпачынку. Падобная прафілактыка дазволіла значна зменшыць колькасць ДТЗ.

gaigrodno.by

Што датычыцца кантролю стану кіроўцаў, то, як растлумачыў Сяргей Глямбоўскі, гэта цалкам і даволі эфектыўна рэгулюецца ўстаноўленымі правіламі. Маршрут і графік перавозкі складаецца аўтамабільным перавозчыкам. Ён павінен і абавязаны вызначыць іх такім чынам, каб кіроўца меў час на кароткі — пасля чатырох гадзін бесперапыннага кіравання — 45-хвілінны перапынак і працяглы — пасля васьмі гадзін знаходжання за рулём. На пытанне карэспандэнта «Звязды», чаму ж шафёры нярэдка засынаюць падчас руху, Сяргей Глямбоўскі адказаў, што падобныя здарэнні маюць месца выключна па прычыне парушэнняў устаноўленых правілаў. Калі ж выконваць рэжым працы і адпачынку згодна з пастановай Мінтранса, ніякага засынання за рулём не будзе. Такім чынам, гаворка ідзе аб так званым чалавечым фактары, інакш кажучы, сам кіроўца адказны за тое, што адбываецца на дарозе. З боку ж кантрольных органаў праводзяцца ўсе мерапрыемствы, закліканыя гарантаваць бяспеку пасажыраў і кіроўцаў.

Акрамя таго, як растлумачыў **Сяргей НАВАСЕЛЬЦАЎ, загадчык аддзела даследаванняў у галіне бяспекі транспартнай дзейнасці БелНДІТ «Транстэхніка»,** вывучаецца вопыт замежных калег. У прыватнасці, пільная ўвага надаецца таму, як у іншых краінах праводзіцца падрыхтоўка кіроўцаў. Цяжка не пагадзіцца, што ад кваліфікацыі і фізічнага стану шафёра напрамую залежыць бяспека аўтамабільнага руху. І тут шматгадовыя напрацоўкі замежных калег могуць дапамагчы істотна палепшыць сітуацыю на нашых дарогах.

Сяргей КУЛАКОЎ

■ Факт

АГАРОДЖЫ З МОГІЛАК — НА МЕТАЛ?

Жыхар Шчучынскага раёна краў з могілак метал для наступнай яго здачы ва ўтыль.

У здзяйсненні крадзяжу падазраецца жыхар вёскі Рэзы 1984 года нараджэння, паведамляе прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама. Падчас наведвання могілак у Шчучыне ён звярнуў увагу на металічныя дэкаратыўныя агароджы магіл, якія вырашыў здаць. Мужчына сарваў 42 фрагменты агароджы. Праз некаторы час прапажу заўважыла сваячка пахаваных на могілках людзей.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі крымінальнага вышуку Шчучынскага РАУС высветлілі асобу падазраванага. Мужчына ўжо быў судзімы за рабаванне з прымяненнем гвалту і разбойнае нападзенне.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Здарэнні

Хлопчык выпіў воцат

А дзяўчынка разбіла тэрмометр

У Бешанковіцкім раёне праваахоўнікам паступіла паведамленне, што да ўрачоў прывезлі дзіця, якое выпіла воцатную кіслату.

Следчыя ўстанавілі, што двое непаўналетніх дзяцей разам з маці знаходзіліся ў гасцях у бабулі ў адной з вёсак Бешанковіцкага раёна. Каля 15.00 чатырохгадовае дзіця зайшло з вуліцы ў дом, узяло са стала ў пярэднім пакоі пластыкавую бутэльку і выпіла з яе вадкасць. У бутэльцы быў 9-працэнтны раствор воцатнай кіслаты, паведамляе УСК па Віцебскай вобласці. Пасля абследавання чатырохгадоваму хлопчыку аказалі медыцынскую дапамогу і адпусцілі дадому.

Увечары таго ж дня 44-гадовая жыхарка Талачына вырашыла вымераць тэмпературу ў чатырохгадовай дачкі. Пакінуўшы без нагляду дзіця з ртутным тэрмометрам, жанчына на некалькі хвілін выйшла ў двор дома па хатніх справах. Калі вярнулася, выявіла, што дачка разбіла градуснік. Баючыся, што дзяўчынка магла адкусіць яго частку, маці выклікала брыгаду хуткай дапамогі. Пасля абследавання ў страваводзе дзіцяці не выявілі слядоў шкла і ртуці.

Сутыкнуліся тураўтобус і грузавік

А ў іншым ДТЗ дарогу закідала адходамі і тушамі жывёл

Турыстычны аўтобус і грузавік сутыкнуліся ў Асіповіцкім раёне.

Аварыя адбылася на трасе М5 Мінск — Гомель. Кіроўца аўтобуса Neoplan, па папярэдняй інфармацыі, адарваўся ад кіравання. Адбылося сутыкненне з грузавіком Hyndai, які ў тым жа напрамку ехаў у бок Гомеля, паведамілі ва УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама. Аўтобус рухаўся па маршруце Мінск — Адэса. У выніку ДТЗ ніхто не пацярпеў. Грузавік і аўтобус атрымалі пашкоджанні.

А ў выніку аварыі пад Скідалем дарогу засыпала адходамі і тушамі жывёл. ДТЗ адбылося на трасе М6 Мінск — Гродна. Паводле папярэдняй інфармацыі, удзельнікамі аварыі сталі грузавы аўтамабіль і веласіпедыстка. Пры рэзкім тармажэнні з кузава машыны на праезную частку вылецеў груз: адходы, вантробы жывёл і нават тушы. Усё гэта, па словах відавочцаў, выглядала непрывабна і мела адпаведны пах. Як паведамілі ва УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама, у аварыі пацярпела веласіпедыстка. Кіроўца не змог пазбегнуць наезду на пажылую жанчыну: з пераломам нагі яна шпіталізаваная

■ Ну і ну!

«Незнаёмка» шантажыравала інтымным фота

У сталічную міліцыю паступіла заява аб прыцягненні да адказнасці асобы, якая пад пагрозай рассылання фотаздымкаў інтымнага зместу вымагала грошы ў мінчаніна.

Праваахоўнікі з Цэнтральнага РУУС устанавілі, што 17 красавіка заяўнік на адным з сайтаў пазнаёміўся з дзяўчынай. Падчас перапіскі тая папрасіла новага візаві выслаць ёй фотавыявы яго аголеных палавых органаў такім чынам, каб на здымку таксама можна было разгледзець твар заяўніка. Хлопец выканаў просьбу, а праз некаторы час яму сталі прыходзіць паведамленні з патрабаваннем аб пераводзе на карт-рахунак грашовых сродкаў у памеры 200 долараў за нераспаўсюджванне кампраметуючых фотаздымкаў у інтэрнэце.

Было ўстаноўлена, што пазначаны карт-рахунак належыць раней не судзімаму 28-гадоваму грамадзяніну П. У ходзе апытання ён растлумачыў, што 12 красавіка ў інтэрнэце пазнаёміўся з дзяўчынай, якой падчас перапіскі выслаў фотаздымак інтымнага зместу. Праз некаторы час яму сталі паступаць паведамленні з патрабаваннямі пераводу грашовых сродкаў на электронны кашалёк за нераспаўсюджванне названых фатаграфій. Пасля пералічэння часткі грошай мужчыну прыйшло новае паведамленне з прапановай супрацоўнічаць — пераводзіць на электронны кашалёк сродкі, якія будуць паступаць на яго карт-рахунак ад іншых падманутых грамадзян. Хлопец пагадзіўся і ў перыяд з 18 па 24 красавіка ажыццяўляў такія пераводы часткі грошай на электронны кашалёк невядомай асобы, а пэўную суму пакідаў сабе.

Міліцыя ўжо мае звесткі аб дзесяці пацярпелых ад дзеянняў інтэрнэт-вымагальніка, асоба якога ўстанаўліваецца. У дачыненні да 28-гадовага трымальніка карт-рахунку распачаты шэраг крымінальных спраў за вымагальніцтва. Яму пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА

«Прачытаў — перадай другому»

Тым больш расказаць ёсць пра што — такіх газет выходзіла больш за паўтары сотні. Да нядаўняга часу — амаль невядомая старонка гісторыі Вялікай Айчыннай. Але дзесяць апошніх гадоў над тым, каб яе «рассакрэціць» і зрабіць больш вядомай шырокай публіцы, працуюць спецыялісты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Менавіта сумесна з галоўнай кніжнай скарбніцай мы і распачынаем новы сумесны праект, прымеркаваны да 75-годдзя вызвалення Беларусі, якое будзем адзначаць у наступным годзе. Назву праекта мы падгледзелі на старонках газет, пра якія маем намер пісаць. «Прачытаў — перадай другому». Гэткі эпіграф на месцы, дзе ў мірны час пралетарыяў заклікалі яднацца, сустракаецца ў многіх выданнях часоў вайны. Чыталі і перадавалі — бераўліва і таемна, змагаліся, верылі ў перамогу. Пра гэта варта пісаць нават цяпер, праз семдзесят пяць гадоў. Пра гэта неабходна ведаць асабліва цяпер, калі ўсё менш жывых сведак тых падзей. А напісанае — яно застаецца. І перачытаць яго ніколі не позна.

СЛОВЫ «Ў ЛІЧБЕ»

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі актыўна працуюць над выяўленнем і пераводам у электронны фармат газет, якія выдаваліся ў часы Вялікай Айчыннай вайны

— Да нядаўняга часу гэтыя падпольныя і партызанскія выданні былі недастаткова вывучаны ў сілу дрэннай захаванасці, раскіданасці па розных сховішчах, шмат з іх невядомыя і не ўведзеныя ў навуковы ўжытак, — расказвае **Алесь СУША, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце.** — Сярод айчынных бібліятэк найбольшую калекцыю такіх выданняў сёння мае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Значная колькасць гэтых газет знаходзіцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ў Нацыянальным архіве...

Алесь Суша, які сам займаўся і працягвае займацца тэмай падпольных і партызанскіх газет, дзеліцца цікавай фактурай. Гэтыя выданні можна назваць паказчыкам добрай арганізацыйнай работы ў тыле фашыстаў. «З мэтай умацавання друкаванай прапаганды ЦК КП(б)Б у 1942 годзе прыняў рашэнне стварыць 10 абласных і 50 раённых падпольных друкарняў. З савецкага тылу былі перапраўленыя журналісты, наборшчыкі, друкары, наладжана масавае выданне газет, — уводзіць спадар Алесь у курс справы. — Да канца 1942 года і на працягу 1943-га выпускалася 134 газеты, уключаючы рэспубліканскія — «Звязду» і «Чырвоную змену». Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б і палітычныя органы партызанскіх фарміраванняў арганізавалі выпуск больш чым 120 найменняў шматтыражных газет. Свае шматтыражкі друкавалі партызанскія брыгады «Разгром», «Дзядзі Колі», «Народныя мсціўцы», імя Варанянскага. Усяго за перыяд акупацыі ў Беларусі выдавалася больш за 160 назваў газет». Вялікая зямля дапамагала значна: па некаторых звестках, на акупаваную тэрыторыю Беларусі было накіравана каля 170 паходных друкарскіх машын. Адтуль звычайна дастаўлялі таксама вельмі каштоўную паперу і іншыя матэрыялы. Але, здаралася, што паперу і фарбу літаральна заваёўвалі ў выніку сапраўдных баявых аперацый з праціўнікам.

Што мы на сёння ведаем пра гэтыя газеты яшчэ? «З-за цяжкасцяў выпуску і недахопу паперы тыражы падпольных газет вагаліся ад некалькіх соцень да тысячы і больш асобнікаў, розны быў і фармат, — расказвае Алесь Суша. — Акрамя перыядычных выданняў у тыле ворага шырока распаўсюджваліся асобна надрукаваныя загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, звароты ЦК КП(б)Б і ўрада рэспублікі, падпольных абкамаў і райкамаў партыі, Чырвонай Арміі да насельніцтва акупаваных раёнаў, зводкі Саўінфармбюро, улёткі і г. д. У партызанскіх фарміраваннях выпускаліся рукапісныя часопісы, насценныя газеты, баявыя лісткі...»

— Над збіраннем гэтых унікальных у многім выданняў вы працуеце не адзін год. Пахваліцца ёсць чым? — пытаюся ў суразмоўніка.

— Яшчэ ў 2008 годзе Нацыянальная бібліятэка Беларусі распачала нацыянальны праект па пошуку, даследаванні, апісанні, алічбоўцы і папулярызацыі гэтых выданняў. Ініцыятыву бібліятэкі падтрымала такая значная міжнародная арганізацыя як ЮНЕСКА. У выніку нарадзіўся праект «Падпольны і партызанскі друк Беларусі», які быў прысвечаны 65-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праект здзяйсняўся ў рамках супрацоўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вынікам праекта стала стварэнне мультымедыйнага электроннага выдання. Праект прадугледжваў выяўленне матэрыялаў, бібліяграфічнае апісанне і алічбоўку матэрыялаў. Усе выяўленыя выданні былі алічбаваны ў нашай бібліятэцы на адмысловых сучасных бескантактавых сканерах. Вынікам праекта стала электроннае выданне, якое выйшла ў 2009 годзе. Віртуальны даведнік уключыў у сябе электронныя копіі дакументаў. На дыску прадстаўлена каля 100 улётак, больш за 120 найменняў газет, газет-плакатаў, рукапісных дакументаў, створаных падпольшчыкамі і партызанамі. Я добра ведаю, што яны выкарыстоўваюцца ў якасці матэрыялу пры паглыбленым вывучэнні курса па гісторыі Беларусі ці больш дакладна — па гісторыі Другой сусветнай вайны, а таксама пры арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў па патрыятычным выхаванні моладзі.

— Як вы лічыце, калекцыя падобных выданняў яшчэ можа папоўніцца?

— Я ў гэтым нават не сумняваюся. Увесь час выяўляюцца ўсё новыя і новыя матэрыялы, якія не былі ўключаны ў старыя бібліяграфіі. У прыватнасці, зусім нядаўна адзін з маіх знаёмых (па яго просьбе не магу назваць імя) прынёс мне даволі вялікую падборку беларускіх перыядычных выданняў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сёння яны папоўнілі фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, але пакуль не адлюстраваны ні ў адным бібліяграфічным паказальніку...

Створаная намі база працягвае папаўняцца і, магчыма, ніколі не завершыцца, бо, на жаль, далёка не ўсё захавалася да нашага часу, а многае яшчэ чакае свайго вывучэння. Тым не менш і электроннае выданне, і створаныя зводныя рэсурсы ўжо сёння працуюць на карысць гісторыкам-даследчыкам, выкладчыкам вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, студэнтам і школьнікам — усім, хто цікавіцца гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

P.S. Ужо ў наступнай публікацыі новага праекта мы пачнём асобна расказваць пра выданні часоў Вялікай Айчыннай і, па магчымасці, пра нашых калег, якія гэтыя выданні стваралі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

9 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15846)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Наталля ЖУК:

«ДЫХАЕМ» З МУЖАМ АДНОЙ ТЭМАЙ»

Тры гады таму муж і жонка Аляксандр БАРШЧОЎ і Наталля ЖУК вырашылі, што хопіць працаваць на іншых і запусцілі ўласны брэнд Limitedminsk, які зараз вельмі папулярны ў моладзі. Крыніцай натхнення выбралі родную Беларусь. Так з'явіліся рэчы з вышыўкай у выглядзе саламянага зубра, бульбы з калорадскім жуком і надпісам-жартам «кароткачасовы дождж амаль без перапынку». «У нас столькі ідэй — не паспяваем усе рэалізаваць», — прызнаецца Наталля. З ёй мы пагутарылі пра тое, чым прыйшлося ахвяраваць дзеля свайго бізнесу, чаму дызайнеру важна глядзець паказы вядучых модных дамоў і што рабіць, калі няма натхнення.

— Калі былі школьніцай, кім марылі стаць?

— З малога ўзросту казала маці, што хачу быць дызайнерам адзення. Я хадзіла на маляванне, мне вельмі падабалася. Бацькі не пярэчылі майму выбару. Хоць з модай з іх ніхто не звязаны: тата быў прадпрымальнікам, а мама — выкладчык матэматыкі і загадчык вучэбнай часткі сярэдняй школы.

Калі вучылася ў Інстытуце сучасных ведаў імя Шырокага, удзельнічала ў конкурсе «Млын моды». Паказвала свае калекцыі ў Швецыі, Літве, Латвіі, Швейцарыі. Пасля вучобы мяне запрашаў працаваць Цэнтр моды ў Мінску. Але там на той момант быў настолькі маленькі заробак, што яго хапіла б толькі на аплату здымнай кватэры (я сама з маленькага гарадка Івацэвічы). Таму вырашыла паехаць у Брэст, дзе шмат швейных прадпрыемстваў. І не пашкадавала: там фабрыкі развіваюцца хутчэй, чым у сталіцы.

Саша праходзіў практыку ў Івана Айплатава і потым супрацоўнічаў з ім. А пасля быў кіраўніком мастацкай групы на трыкатажнай фірме.

— Чаму вас навучыла работа на вытворчасці?

— Калі пачынаеш працаваць, разумееш, што ўсё не так, як сабе ўяўляў. Думала, буду прыходзіць на восем гадзін і ціха сабе маляваць. Насамрэч мастак на любым прадпрыемстве працуе 12 гадзін у дзень, бо ідэі ўзнікаюць пастаянна. Плюс на цябе кладзецца адказнасць перад усёй кампаніяй: ты павінен прадумаць калекцыю, выбраць тканіну, прапанаваць тое, што будзе прадавацца. Такія нервы! Але цікава. Гэты вопыт дапамагае ўсвядоміць, ці тым ты займаешся, паглядзець на індустрыю знутры, даведацца пра сістэму арганізацыі прадпрыемства. Разумееш, што без каманды нічога не атрымаецца — сам усё не зробіш.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Важацкі хлеб

КАМУ ПА СІЛАХ УЗНАЧАЛІЦЬ «ДЫНАСТЫЮ»?

Летам тысячы дзяцей весела бавяць час у лагерах адпачынку. Аднак за бесклапотнымі, на першы погляд, гульнямі і забаўкамі хаваецца насамрэч карпатлівая праца. Якім чынам яна арганізаваная? Адказ на гэтае пытанне карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» шукалі ў педагагічным атрадзе «Ветразь», у якім сёння распачынаецца чацвёртая, апошняя, змена.

— У нас зараз знаходзяцца 240 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 16 гадоў, — кажа **старшы педагог дзіцячага аздараўленчага лагера «Палітэхнік» Уладзімір САМУЛЕНКАЎ.** — Яны падзелены на 9 атрадаў. Для трэцяй змены мы абралі назвы вядомых гістарычных дынастый — Бурбоны, Цюдоры, Мін... Атрады скамплектаваны так, каб у іх уваходзілі дзеці прыкладна аднаго ўзросту плюс-мінус год. Усе важатыя — гэта або студэнты, або сёлетнія выпускнікі. Сярэдні ўзрост — 22-23 гады. У нашых шэрагах ёсць нават першакурснікі. Як правіла, яны самі неаднаразова прыязджалі ў лагер школьнікамі і таму добра ведаюць яго жыццё «знутры».

Сёлета ўвайсці ў «Ветразь» захацелі больш за 280 чалавек. Хоць атрад арганізаваны на базе БДПУ, але патэнцыяльныя кандыдаты прыходзяць з розных вышэйшых навучальных устаноў і нават каледжаў. Гэты год для атрада адметны: ён упершыню працуе на базе адразу двух лагераў — «Палітэхніка» і «Спадарожніка». У апошнім дагэтуль «Ветразь» працаваў ажно васямнаццаць гадоў.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Разумнікі і разумніцы

«ЗАМЕСТ БАСЕЙНА РАШАЮЦЬ ЗАДАЧЫ»

Як можна спалучыць адпачынак з матэматыкай і фізікай?

Каля 300 вучняў сабрала XXIII Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа навучэнцаў і настаўнікаў, якая прайшла на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна». 80 працэнтаў яе ўдзельнікаў былі пераможцамі інтэлектуальных спаборніцтваў па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы і астраноміі самых розных узроўняў — ад абласнога да міжнароднага.

Пачнём з таго, што дзённы расклад быў зусім не падобны на школьны: спецкурсы, лекцыі, практычныя заняткі распачыналіся ў 9.45, а ў 14.30 прадугледжвалася «цікавая гадзіна», якую большасць «шкаляроў» прысвячала самападрыхтоўцы. З 17.30 — спартыўныя гульні. Між іншым, і ў 20 гадзін навучальны дзень яшчэ не быў скончаны: увечары працягваліся кансультацыі, рэпетыцыі, ішла падрыхтоўка да выніковай канферэнцыі, праводзіліся ўнутраныя інтэлектуальныя спаборніцтвы.

Робататэхніка, канструяванне, для самых моцных матэматыкаў — інверсія, элементы тэорыі мностваў, ураўненне Пеля. Газавыя законы і магнітныя з'явы — для будучых фізікаў. Камбінаторыка — для інфарматыкаў... У школе працавалі 18 навучальных груп, разлічаных на розны ўзрост і ўзровень засваення той ці іншай дысцыпліны. Акрамя таго можна было наведваць лекцыі і семінары па псіхалогіі, малодшых школьнікаў запрашалі спецыяльныя заняткі па даследчай рабоце.

— Матэматыка — гэта агульная мова стасункаў для ўсіх: фізікаў, хімікаў, біёлагаў і астраномаў, — падкрэслівае **дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Павел МАНДРЫК.** — Дысцыпліна — навука складаная, яе любіць трэба, але каму не цікава, той сюды не едзе. У нашай школе ўнікальная атмасфера: дзеці і ў футбол гуляюць, адпачываюць, і даследаванні праводзяць. У басейн часам ісці не хочуць, а сядзяць і задачкі рашаюць.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
9 08 2018 г.

Рух ад сэрца

«МАЯ ШКОЛА» — УРОКІ ДАБРЫНІ

Бяром некалькі студэнтаў, прыбаўляем шчырае жаданне дапамагчы іншым, памнажаем на ініцыятыву і добры настрой і атрымліваем сотні дзіцячых усмешак! Вось такую незвычайную матэматыку можна вывучыць у «Маёй школе» — дабрачынным валанцёрскім праекце БДУ.

Ідэя яго стварэння з'явілася ў 2012 годзе ў Ксеніі Воўк, цяпер ужо выпускніцы факультэта міжнародных адносін БДУ. Валанцёры працуюць у розных кірунках: дапамагаюць выхаванцам дзіцячых дамоў выканаць дамашнія заданні і навярстаць школьную праграму, далучаюць дзетак да спорту і арганізоўваюць матчы па футболе, праводзяць для малых забаўляльныя мерапрыемствы з гульнямі, тэатральнымі пастаноўкамі і падарункамі.

За гэтым заняткам і падурэць можна!

Сёння ў скарбонцы «Маёй школы» ўжо некалькі буйных акцый. Напрыклад, у 2015 годзе валанцёры арганізавалі фотапраект «Сонечная прафесія», які быў накіраваны на падтрымку дзяцей з сіндромам Даўна. Кожнае «сонечнае» дзіця расказала, кім хоча стаць, калі вырасце, а затым яго фатаграфавалі ў вобразе будучай прафесіі: маленькія футбалісты, пчаляры, мастакі — каго дзеці толькі не выбіралі! Прэзентацыя здымкаў адбылася ў Міжнародны дзень чалавека з сіндромам Даўна.

Яшчэ адзін незвычайны праект пад назвай «Бумеранг дабра» студэнты ажыццявілі вясной мінулага года. Некалькі тыдняў валанцёры наведвалі дзіцячыя дамы Мінска і праводзілі майстар-класы па вырабе брошак у выглядзе жывёл. Дзве брошкі дзеці пакідалі сабе, а іншыя дзве адпраўляліся ў гандлёвы цэнтр «Galleria Minsk». У ім можна было купіць корм і медыкаменты, неабходныя прытулкам для жывёл, і аддаць іх валанцёрам. У падарунак неабыякавыя людзі атрымлівалі самаробныя брошкі і паштоўкі з падзякай ад дзетак.

Сёння кіраўнік праекта «Мая школа» — Караліна Чарнашэй, сёлетняя выпускніца факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. «Быць валанцёрам — не так проста, — прызнаецца дзяўчына. — Недастаткова адзін раз наведаць дзіцячы дом і лічыць, што ты зрабіў вялікую справу. Каб падрыхтаваць нейкую акцыю, трэба патраціць шмат часу і сіл: мы праводзім сходы, на якіх абмяркоўваем ідэі для будучага мерапрыемства, думаем над іх увасабленнем, звязваемся са спонсарамі, прыцягваем СМІ. Гэта складаная і сур'ёзная работа».

Майстар-клас па вырабе брошак у дзіцячым доме № 5.

Па словах Караліны, для праекта патрэбны крэатыўныя людзі з вялікім запасам ідэй. Бо цяпер звычайнымі песнямі і казкамі дзяцей не здзівіш. Канешне, важна быць адкрытым, ветлівым, прыязным. Але самая галоўная якасць валанцёра — адказнасць. «Неабходна ўсведамляць усю сур'ёзнасць таго, чым ты займаешся. Дзеці бяруць прыклад амаль з кожнага, хто да іх прыходзіць. А значыць, валанцёр павінен паводзіць сябе правільна. Толькі чалавек, які адказвае за свае ўчынкі, здольны працаваць з дзецьмі», — сцвярджае кіраўнік праекта.

Дзяўчына таксама паведаміла, што выхаванцы дзіцячых дамоў вельмі не любяць, калі іх шкадуюць, яны крыўдзяцца, хоць і не заўсёды гэта паказваюць. Важна размаўляць з імі, як са звычайнымі дзецьмі і нават як з аднагодкамі, нягледзячы на тое, што яны маленькія. Варта не шкадаваць, а падумаць, як можна дзеткам дапамагчы: пагаварыць, развесяліць, прывезці цацкі або прысмакі.

Работа з дзецьмі прыносіць мора пазітыву і станоўчых эмоцый. А яшчэ ў вас з'явіцца шмат маленькіх шчырых сяброў. Напрыклад, у Караліны ёсць верная сяброўка Марына. Дзяўчаты часта размаўляюць па тэлефоне пра ўсё на свеце, школьніца заўсёды чакае Караліну ў госці.

Сваімі ўражаннямі падзялілася і валанцёр Карына Кантар, выпускніца біялагічнага факультэта БДУ. Дзяўчына дапамагае дзецям выконваць дамашнія заданні: «Летась я займалася з Анечкай, яна вучылася ў пачатковай школе. Калі мы толькі пазнаёміліся, чытаць дзяўчынка не ўмела. Анечка спрабавала схітрыць: прасіла мяне нешта прачытаць і на слых запамінала тэкст, а затым быццам бы чытала яго сама. Канешне, я адразу раскрыла яе сакрэт і змяніла тактыку. Цяпер дзяўчынка выдатна чытае! А фенаменальная памяць таксама спатрэбілася: Анечка вучыць вершы і з задавальненнем мне іх расказвае».

Калі вы цвёрда вырашылі стаць членам дружнай каманды валанцёраў, трэба толькі напісаць Караліне або іншым удзельнікам праекта ў сацыяльных сетках. Запрашаем усіх на ўрокі дабрыні ў «Маёй школе»!

Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,
студэнтка III курса
факультэта
журналістыкі БДУ.

Абітурыент-2018

Новыя кваліфікацыі для рабочых рук

У новым навучальным годзе на базе сталічных установ прафтэхадукацыі распачнецца падрыхтоўка па дзевяці новых для горада кваліфікацыях.

Так, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж чыгуначнага транспарту будзе рыхтаваць памочнікаў машыніста электрацягніка. Каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — кавалёў ручнога кавання і абліцоўшчыкаў сінтэтычнымі матэрыяламі. Каледж мантажных і пад'ёмна-транспартных работ — слесараў-электрыкаў па рамонце электраабсталявання і зборцы металаканструкцый. У прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці і бытавога абслугоўвання насельніцтва з'явіцца спецыяльнасць «прыёмшчык заказаў (цырульніцкія паслугі)», у механіка-тэхналагічным каледжы — «кулінар мучных вырабаў», прафесійным ліцэі № 9 аўтамабілебудавання — «маляр (па метале)». Каледж будаўнікоў, ліцэі № 7 і № 12 будаўніцтва вядуць набор на спецыяльнасць «мантажнік каркасна-абшывачных канструкцый сухога будаўніцтва». Гэтая прафесія — новая не толькі для горада, але і для краіны.

Новыя спецыяльнасці з'явяцца і ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У Мінскім дзяржаўным каледжы сферы абслугоўвання распачнецца падрыхтоўка па спецыяльнасці «сацыяльная работа», а ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. А. Кедышкі — па спецыяльнасці «візуальны мерчандайзінг».

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання будзе весціся ва ўстановах прафтэхадукацыі да 20 жніўня. Калі да канца гэтага тэрміну не ўсе планавыя месцы будуць запоўненыя, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года.

Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі завяршаецца 9 жніўня, на платную форму навучання — 16 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Карысны досвед

Як стаць найлепшым?

Знайсці матывацыю. Нават на канікулах

Увесну прайшоў заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па 17 прадметах, у якой прынялі ўдзел 1460 вучняў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Дыпломамі было ўзнагароджана 87 чалавек, лідзіравалі ў камандным заліку школьнікі з Мінска, а таксама з Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Быць найлепшым не так проста: для гэтага вучні прыкладаюць вялікія намаганні. У кожнага героя — свая гісторыя...

Анастасія Слуцкер атрымала дыплом першай ступені на алімпіядзе па грамадазнаўстве. Яна выпускніца 10 класа сталічнай гімназіі № 8.

— Грамадазнаўства першапачаткова было ў спісе прадметаў, якія мне падабаліся і якія трэба здаваць пры паступленні, але калі б не настаўнік, то я наўрад ці дайшла б да алімпіяды. Самае складанае — прымусіць сябе чытаць і вучыць. Але нежаданне кагосьці падвесці давала мне матывацыю, — расказвае Анастасія. — Калі даведалася пра курсы перад рэспубліканскай алімпіядай, паставілася да іх вельмі скептычна, але ў канцы алімпіяды маё меркаванне змянілася. А галоўны «ўдар» пры падрыхтоўцы прыйшоўся на канікулы, калі даводзілася ахвяраваць асабістым часам.

Аляксандра Маляўка з Гродна скончыла 11 клас ліцэя № 1, яна дасягнула вышынь у вывучэнні «навукі зорак» — астраноміі. Двойчы заваявала дыплом першай ступені на рэспубліканскай алімпіядзе, сёлета стала абсалютным пераможцам. Мае пахвальны водгук IOAA-2017 (міжнароднай алімпіяды па астраноміі і астрафізіцы), дыплом другой ступені Санкт-Пецярбургскай астранамічнай алімпіяды.

— Шчыра прызнацца, у самым пачатку думкі аб удзеле ў рэспубліканскай і тым больш міжнароднай алімпіядзе здаваліся далёкімі ад рэальнасці, больш захапляў сам працэс вывучэння прадмета. Ці цяжка давалася падрыхтоўка? Ёсць колькасць укладзеных сіл і часу, плюс твая зацікаўленасць у выніку, — расказвае Аляксандра. — Зразумела, нельга адмаўляць наяўнасць схільнасці да пэўнага роду дзейнасці, калі адчуваеш сябе «на сваім месцы». Думаю, астраномія і стала тым заняткам, дзе мне ўдалося адчуць, што я іду ў правільным кірунку і раблю гэта ў добрай кампаніі. Калі моцна захацець і правільна арганізаваць свой час, можна сумясціць практычна ўсё. Нават рашыць дзвесце задач, паралельна выканаць пяць практычных работ і вывучыць на памяць верш (усё да заўтрашняй раніцы). Але, нагружаючы мозг, нельга забываць і аб целе, фізічных нагрузках — цяпер я займаюся ў трэнажорнай зале.

Ганна Волкава — выпускніца 10 класа сталічнай гімназіі № 21. Поспехаў дзяўчына дабілася ў вывучэнні беларускай мовы і літаратуры, узяўшы дыплом першай ступені на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды.

— Насамрэч, я заўсёды разумела, што мяне цікавіць вывучэнне моў, літаратуры і гісторыі, таму, канешне, і маю поспехі менавіта па гэтых школьных прадметах. Нельга, зразумела, не адзначыць вялікую падтрымку з боку маёй настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, яе педагагічны талент, прагу да сваёй працы і ўменне ўбачыць патэнцыял у сваіх навучэнцаў. А два месяцы рэспубліканскіх збораў далі мне той пласт ведаў, якія ніколі не атрымаць на звычайных занятках у школе, — дзеліцца Ганна. — Што датычыцца матывацыі: яе трэба шукаць толькі ўнутры сябе самога. Калі ты сапраўды нечага жадаеш, то ўсё зробіш так, як трэба. Два месяцы перад алімпіядай я размаўляла толькі на беларускай мове. Бацькі падтрымліваюць мяне ў любым пачынанні, за што ім вялікі дзякуй.

Але ж алімпіяда — гэта не толькі адукаванасць і падрыхтоўка вучняў: важную ролю адыгрывае настаўнік. Ён і закладвае веды ў галовы маладых талентаў, прывівае любоў да прадмета.

Настаўнік геаграфіі сталічнай гімназіі № 8 Іван Васілевіч Булва, які сам у 2003—2005 гадах быў абсалютным пераможцам рэспубліканскіх алімпіяд па геаграфіі, раіць «зялёным алімпіяднікам»: «Не губляйце час нават летам. Самападрыхтоўка дапаможа менш напружвацца падчас наступнага навучальнага года. Зазірайце ў падручнікі за старшыя класы. Таксама падтрымлівайце стасункі са старэйшымі таварышамі-алімпіяднікамі — яны дапамогуць не толькі добрай парадай, але і патрэбнай літаратурай. Абавязкова знайдзіце курсы па вашым прадмеце, якія на міжшкольным узроўні праводзяць выкладчыкі з універсітэтаў».

Анастасія СУРЫНАВА,
выпускніца 10 класа гімназіі № 8 г. Мінска.

Пераемнасць

ВЛКСМ — ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт новаму праекту «100 дзён да 100-годдзя», які прысвечаны векавому юбілею ВЛКСМ.

Можна па-рознаму ставіцца да ідэалаў мінулага: настальгіраваць па іх ці, наадварот, лічыць перажыткам мінулай эпохі, але той факт, што камсамол даў пуцёўку ў жыццё многім маладым людзям і стаў для іх сапраўднай школай жыцця, бясспрэчны.

ВЛКСМ паклаў пачатак маладзёжнаму руху і ў нашай краіне. Яго найлепшыя традыцыі, толькі ў сучасным фармаце, вось ужо амаль 16 гадоў развівае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Новы медыяпраект скіраваны на захаванне пераемнасці пакаленняў і традыцый, фарміраванне ў сучасных юнакоў і дзяўчат цікавасці да вывучэння гісторыі маладзёжнага руху і прадугледжвае правядзенне маштабнай даследчай работы па вывучэнні подзвігаў славутых камсамольцаў, а таксама простых членаў арганізацыі, чые юнацтва і маладосць загартоўваліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, хто сваёй працай уздымаў краіну з руінаў у пасляваенны перыяд, развіваў эканоміку, навуку і культуру, праслаўляў спартыўнымі дасягненнямі.

Беларусы змогуць падзяліцца сямейнымі гісторыямі пра камсамол. Абсалютна кожны можа расказаць пра сябе, сваіх бацькоў і дзядоў, даслаць фотаздымкі і матэрыялы... Цікавасць уяўляе ўсё: знакавыя будоўлі на тэрыторыі Беларусі, маладзёжныя вяселлі, турпаходы і злёты, праца ў будатрадах...

Падчас рэалізацыі медыяпраекта «100 дзён да 100-годдзя» на сайце «Моладзь Беларусі» brsm.by і ў аднайменнай групе

ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» будзе створаны каляндар знакавых падзей маладзёжнага руху.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вучоба «ў полі»

Валанцёр, да дзіцячага «Еўрабачання» будзь гатоў!

У сталічным Дзіцячым парку імя Максіма Горкага адбыўся валанцёрскі open-air «Мы — каманда!». На сустрэчу пад адкрытым небам Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі запрасіў кандыдатаў у валанцёры на Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2018» і ўдзельнікаў гэтага конкурсу розных гадоў.

Open-air аб'яднаў каля 70 актывістаў Саюза моладзі, многія з якіх мелі добраахвотніцкую практыку на буйнамаштабных міжнародных спартыўных і культурна-забаўляльных мерапрыемствах. Свае пытанні яны маглі задаць Вользе Сацюк, першай беларусцы, якая прадставіла краіну песняй «Танцуй» на дзіцячым «Еўрабачанні» ў 2003 годзе, і валанцёру БРСМ «Добрае Сэрца» Хелене Мерааі — прадстаўніку Беларусі на гэтым папулярным конкурсе ў 2017 годзе.

У праграме мерапрыемства была работа інтэрактыўных пляцовак і інфапункта па прыёме заявак «Я валанцёр!», трэнінгі на камандаўтварэнне, абмен вопытам удзелу ў праектах міжнароднага фармату, танцавальны батл «Мы разам!» і іншае.

Нагадаем, у пачатку ліпеня Саюз моладзі даў старт набору валанцёраў, якія пад эгідай Белтэлерадыёкампаніі ў перыяд з 1 да 27 лістапада будуць задзейнічаны ў рабоце з замежнымі дэлегацыямі, што прыбудуць у Беларусь для ўдзелу ў мерапрыемствах дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2018», а таксама тэхнічнага, творчага персаналу, які займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем гэтага маштабнага міжнароднага форуму.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

Грамадскасць Навагрудка выступіла з ініцыятывай добраўпарадкавання тэрыторыі крыніцы, размешчанай у самым цэнтры горада, у ваколіцах Замкавай гары.

Крыніца, дай вады напіцца!

Раённыя арганізацыі БРСМ і «Белай Русі» арганізавалі з гэтай нагоды працоўную акцыю. Актыў грамадскіх аб'яднанняў правёў абкошванне пустазелля навокал, ачысціў саму крыніцу ад каменя і галінак. Дзякуючы сумесным намаганням яна набыла новы дагледжаны выгляд. Цяпер жыхарам і гасцям горада будзе зручна набраць вады ў гэтым прыгожым куточку.

— Нашы продкі заўсёды старанна аберагалі крыніцы. Людзі сачылі, каб у ваду не трапляла смецце, упрыгожвалі месцы вакол іх. На жаль, сучаснае жыццё, цэнтральнае водазабеспячэнне прывялі да таго, што некаторыя крыніцы сталі закінутымі і незапатрабаванымі. Апошнім часам для нас жыццёва важнай праблемай з'яўляецца вяртанне да вытокаў, адраджэнне беражлівага стаўлення да розных прыродных аб'ектаў, — кажа **першы сакратар Навагрудскай раённай арганізацыі БРСМ Вольга ШНІГІР.** — У тым ліку і крыніцы неабходныя ўсім нам, каб памятаць продкаў, паважаць традыцыі народа, сваёй малой радзімы. Да таго ж яны свайго кшталту паказчык экалагічнага стану таго месца, у якім знаходзяцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЗАМЕСТ БАСЕЙНА РАШАЮЦЬ ЗАДАЧЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Упершыню Рэспубліканская навукова-даследчая школа прайшла ў 1995 годзе на Віцебшчыне, у пасёлку Лужасна, дзе дзейнічала школа-інтэрнат-гімназія для здольных і адораных дзяцей. Яе ўдзельнікамі тады сталі 65 школьнікаў і 30 педагогаў. Пазней арганізацыя школы перайшла да факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Калі праз колькі гадоў яе ўдзельнікі становяцца нашымі студэнтамі, то ўжо самі дапамагаюць з арганізацыяй чарговай летняй змены для вучняў.

Якія ж якасці павінны быць уласцівыя сапраўднаму вучонаму? Арганізатары школы ўпэўнены, што гэта творчасць і крэатыўнасць, уменне супрацоўнічаць, знаходзіць паразуменне і камандны дух, духоўнасць і інтэлігентнасць. Таму, акрамя адукацыйнага, тут не забываюцца і пра культурны складнік. Напрыклад, ладзяць літаратурныя вечарыны. Вершы гучаць на розных мовах: беларускай, рускай, польскай, французскай, англійскай...

Са школьнікамі працуюць больш як 40 выкладчыкаў з розных універсітэтаў краіны, вучоныя з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, сярод якіх дактары і кандыдаты навук, кіраўнікі беларускіх камандаў на міжнародных алімпіядах, турнірах і канферэнцыях.

Таксама да юных матэматыкаў прыязджаюць выкладчыкі з Расіі, сярод якіх сёлета быў і **доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар базавай кафедры Матэматычнага інстытута імя У. А. Сцяклова РАН Аляксандр БУФЕТАЎ.**

— Я працую з дзецьмі з 1995 года і бачу, што тут, у Беларусі, шмат таленавітых маладых матэматыкаў з вялікім патэнцыялам. Але, на жаль, многія з іх, найчасцей юнакі, арыентаваныя на ІТ-сферу. У пэўнай ступені матэматыка аказваецца «папялушкай» у праграмавання. А мне хочацца даказаць гэтым надзвычай адораным маладым людзям, што яна — таксама перспектыўны кірунак. Для іх самарэалізацыі ў гэтай сферы ёсць усе ўмовы. У «Брыганціне» я чытаю курс па тэорыі мностваў. Апроч свайго выключна матэматычнага зместу, тэорыя пераклікаецца і з філасофскай праблематыкай. Яна, на жаль, не ўключаецца ў школьную праграму, аднак у багажы ў кожнага матэматыка павінна быць.

Зараз у свеце вельмі актыўна развіваецца STEAM-адукацыя: S — science, T — technology, E — engineering, A — art, M — mathematics (прыродазнаўчыя навукі + тэхналогія + інжынернае мастацтва + творчасць + матэматыка). Выкладчыкі пацвярджаюць, што дзяцей трэба вучыць і выхоўваць комплексна, рыхтаваць адначасова па ўсіх гэтых кірунках. За мяжой такі прадмет, як «science», ёсць у кожнай школе. Ён прысвечаны прыродазнаўчым навукам і арыентаваны на 4-6 класы. Дзяцей не вучаць фізіцы або хіміі, а пачынаюць навучанне з курса, які ўключае матэрыялістычнае разуменне свету.

Падчас летняй школы такі курс праходзяць вучні малодшых класаў. Самаму маленькаму ўдзельніку было ўсяго 6 гадоў. А адзін з самых дарослых і вопытных удзельнікаў Рэспубліканскай школы — Данііл Гомза. Гэтым летам юнак у складзе зборнай Беларусі заваяваў «золата» на Міжнародным турніры юных матэматыкаў у Францыі. Акрамя таго, ён з'яўляецца ўладальнікам дыплома другой ступені гарадской алімпіяды па матэматыцы і дыплома другой ступені заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы. З шостага класа хлопец наведвае «ЮНІцэнтр-XXI». Гэта навукова-даследчы і метадычны цэнтр для выкладчыкаў і навучэнцаў, які функцыянуе на базе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ ўжо больш за 20 гадоў. Побач з ім **(на фота)** — яго сяброўка і аднакласніца Аляксандра Новік (абое вучацца ў сталічнай гімназіі № 41), якая прывезла «серабро» з Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат. Інтэлектуальнае спаборніцтва праходзіла ў Фларэнцыі (Італія) у красавіку.

«З гэтымі дзецьмі няпроста размаўляць, ім адразу зразумела, што калі два канцы «не вяжуцца», то нічога талковага з гэтага не атрымаецца. Менавіта з такіх навукоўцы і вырастаюць, — усміхаецца Павел Мандрык. — Калі ўдзельнікі летняй школы расстаюцца, то плачуць. Затое потым яшчэ не раз сустракаюцца. Тут знаходзяць сапраўдных сяброў...»

Многія з апошняй змены сустрэнуцца ўжо зусім хутка. У снежні пад эгідай Міністэрства адукацыі адбудзецца XX Рэспубліканскі турнір юных матэматыкаў. У два этапы (у кастрычніку сёлета і ў лютым — сакавіку 2019 года) пройдзе Міжнародны матэматычны турнір гарадоў. Самыя вопытныя будуць прадстаўляць Беларусь вясной наступнага года на міжнародных канферэнцыях маладых навукоўцаў і міжнародных турнірах юных матэматыкаў і фізікаў. Праз год усіх зноў збярэ ўжо XXIV Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа навучэнцаў і настаўнікаў. Падчас цырымоніі закрыцця ўсім удзельнікам дораць футболкі з лагатыпам Рэспубліканскай летняй школы і надпісам «Брыганціна». Пасля юныя даследчыкі з гонарам будуць іх насіць і радаваць нас сваімі дасягненнямі.

Паліна ДАЎГІЛЕНКА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
9 08 2018 г.

Нябачныя масты

ВОСЬ ГЭТА «ЗАМЕС»!

Хто дапамагае будаваць студгарадок у Мінску

Чым беларуская сталіца можа завабіць піцерцаў? Архітэктурай, гісторыяй, нізкімі цэнамі? Маладзёжнай будоўляй! З 15 ліпеня да 25 жніўня хлопцы і дзяўчаты з Санкт-Пецярбурга ў складзе беларуска-расійскага атрада дапамагаюць узводзіць інтэрнат у Студэнцкай вёсцы. Мы завіталі туды ў разгар працоўнага дня і даведаліся, што стамляе байцоў больш за афарбоўку сцен і вынас смецця, і чым ім запомніўся Мінск.

...На дварэ спякота. А на будоўлі з васьмі раніцы кіпіць работа. Студэнтам даручаюць заданні, якія не патрабуюць кваліфікацыі: пераносіць блокі, тынкаваць сцены, выграбаць пясок.

У складзе расійскага будатрада 15 студэнтаў. За камандзіра — Мікіта Бяльдзянаў, чацвёртакурснік Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Да цяжкай фізічнай работы ён звыклы.

— Дзякуй бацьку і дзеду, навучылі. У нас на лецішчы бясконцая будоўля, — усміхаецца студэнт. — Фізічная праца мне больш па душы, чым з дзецьмі вазіцца, як у педагагічным атрадзе. Дый будаўнікі ў фінансавым плане выйграюць. Нам абяцалі ў сярэднім 25 тысяч расійскіх рублёў (ці каля 800 беларускіх рублёў. — **Аўт.**) за месяц.

Для Мікіты час за работай пралятае незаўважна. Да спякоты, кажа, прывык, тым больш у Піцеры зараз тэмпература вышэйшая. А вось да беларускай вільготнасці трэба яшчэ адаптавацца.

Арцём Баляеў вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым універсітэце. Пасля лекцый часам падпрацоўвае — робіць будаўнічыя праекты для падрадных арганізацый. Атрымае дыплом — будзе прарабам ці праекціроўшчыкам. А пакуль шчыруе рознарабочым.

Для расійскіх студэнтаў, большасць якіх у Беларусі ўпершыню, БРСМ арганізаваў бясплатныя экскурсіі па сталіцы. Моладзі пакажуць Нацыянальны мастацкі музей, Мінскі трактарны завод, кандытарскую фабрыку «Камунарка», музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Байцы ўжо паспелі пабываць у аквапарку «Лебядзіны».

— Я сама з Краснадарскага краю, таму ведаю, якія яны бываюць, і, калі паглядзела ваш, была прыемна ўражана, — дзеліцца Паліна Кажура, другакурсніца Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

Паліна — адна з трох дзяўчат у атрадзе. Будучы менеджар у сферы турызму планавала правесці гэта лета ў Крыме ці Сочы — у складзе сэрвіснага атрада. Працавала б кухарам, афіцыянткай ці аніматарам. Але не склалася, і трэба было тэрмінова шукаць альтэрнатыву.

— Не пашкадавала ні кроплі, што апынулася тут. Сама ў дзяцінстве з бацькамі дом будавала, таму ведаю, як шпакляваць і тынкаваць. Але дзяўчатам тут складаную работу не даюць, стараюцца нас моцна не перагружаць. Мы фарбавалі, падмяталі, але пераважна працуем з дакументацыяй.

Дзяўчаты з самага пачатку склалі план, куды пайсці ў Мінску. Прагуляліся па цэнтры, паглядзелі стадыён «Дынама», бо прачыталі, што яго нядаўна рэканструявалі. Паліне спадабалася ў раёне Нямігі.

— На будаўнічым аб'екце не стамляемся. Цяжэй дома (байцы жывуць у студэнцкім інтэрнаце. — **Аўт.**), калі трэба накарміць хлопцаў. Што гатуем? Мы ж ехалі ў Беларусь, таму бульбу, — жартуе

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Паліна. — Супчыкі варым. У вас тушонка вельмі смачная — пастаянна ядзім яе з грэчкай, макаронай. Карацей, стандартнае паходнае меню.

— Дзяўчаты добра гатуюць, малайчыны, — хваліць гаспадынь Аляксей Дудараў, студэнт з Архангельска, які воляй лёсу таксама трапіў у гэты атрад.

Лёша вывучае сацыяльную работу ў Паўночным (Арктычным) федэральным універсітэце імя Ламаносава. Тры гады працаваў у будатрадзе «Мядзведзь» — на касмадроме «Усходні», на аб'ектах Мінабароны ў Североморску, у прэзідэнцкім кадэцкім вучылішчы ў Петразаводску.

Прызнаецца, што ў студгарадку працаваць не складана. Калі на іншых будоўлях быў дзесяцігадзінны рабочы дзень, то тут — васьмігадзінны. І два выхадныя, а не адзін.

Заробленыя за лета грошы Лёша траціў па-рознаму. Купіў камп'ютар, тэлефон, адкладваў на кішэнныя расходы на год, каб у бацькоў не прасіць. А сёлета хацеў бы з'ездзіць куды-небудзь адпачыць.

Хлопец любіць падарожнічаць, таму яму цікава было паглядзець Беларусь. «Шкада, што ў Мінску мала гістарычных аб'ектаў, але, я так разумею, гэта звязана з тым, што горад быў цалкам разбураны ў гады вайны. Здзівіла мінскае метро — усяго дзве веткі. Пасля Масквы і Пецярбурга гэта нязвыкла».

Будучы інжынер-аўтаматызатар Канстанцін Цярэнцьеў, калі ехаў сюды, ведаў, што Мінск — горад чысціні і прыемных людзей.

— Што кідаецца ў вочы? Адчуваецца дух СССР. У вас прадукты больш танныя. Архітэктура цудоўная, я ніколі не бачыў будынкаў такіх формаў. Людзі адкрытыя — у Піцеры больш недаверлівыя. Карацей, мне вельмі падабаецца горад. Я, магчыма б, нават тут застаўся, калі б не вучоба, — кажа хлопец.

Таму, што трапіў у будатрад, студэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага марскога тэхнічнага ўніверсітэта рады.

За свае 25 тысяч рублёў, зароблены за змену, Косця хоча купіць гітару. «Паглядзім, спачатку трэба іх атрымаць, а ўжо потым распараджацца бюджэтам», — разважае ён.

На тое, што дзеля работы ў атрадзе давялося ахвяраваць адпачынкам, ніхто з байцоў не паскардзіўся. «Мы і тут адпачываем, тым больш у такой добрай кампаніі», — смяюцца хлопцы і дзяўчаты.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

КАМУ ПА СІЛАХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Усе будучыя важатыя праходзяць праз спецыялізаванае навучанне. Пачынаецца яно задоўга да лета — у снежні — студзені, і ўключае ў сябе пяць этапаў. Першы з іх — гэта гутарка. Перавага на ёй аддаецца адкрытай, матываванай, шчырай моладзі. Дапамагае ў адборы кваліфікаваны псіхолаг.

Пасля гутаркі кандыдаты ў важатыя дзеляцца на мікрагрупы, за імі замацоўваюцца куратары, якія даюць заданні на выхад з зоны камфорту, праверку прафесійнай прыдатнасці, псіхалагічную сумяшчальнасць. Такая работа доўжыцца каля трох тыдняў. Тыя, хто на гэтым этапе не адсеяўся, пераходзяць да вочнага навучання. Яно шмат у чым падобнае да класічных універсітэцкіх заняткаў, але асноўны ўпор зроблены на семінары і трэнінгі. Пасля ідзе практыка. Шматлікія мерапрыемствы, якія праходзяць у рамках лагера, размяркоўваюцца паміж навучэнцамі і «прайграюцца». Бо калі будзе прабел у ведах, то давядзецца экстранна выпраўляць сітуацыю ўжо на месцы, а кантакт «важаты — дзеці» рызыкуе быць парушаны. І «вішанька на торце» — выязное навучанне непасрэдна ў лагеры. За тры дні будучыя важатыя мадэлююць усе магчымыя сітуацыі — заезд, рассяленне, кантакты з бацькамі, вячэрнія «свечкі»-зборы, дзе члены атрада абмяркоўваюць адзін аднаго. З 280 чалавек, якія пачыналі вучобу, навучанне паспяхова скончылі толькі 200.

Кацярына Макарава працуе важатай у атрадзе «Ветразь» ужо другі год, яна скончыла другі курс БДПУ. Вучыцца дзяўчына на факультэце дашкольнай адукацыі. Пад яе кіраўніцтвам — дынастыя «Бурбоны».

— Мае выхаванцы — дзеці ва ўзросце 13-14 гадоў. Той самы пераходны ўзрост — гіперактыўнасць і непаслухмянасць, праз што праходзілі ўсе мы, — смяецца Кацярына. — Самае складанае — сказаць падлеткам, што ўжо 22.30 і надышоў час адбою пасля дыскатэкі. А раніцай усе хочуць больш паспаць. Па першым часе яшчэ ёсць «жаваранкі», якія ўстаюць а 6-й гадзіне і нават раней, але пасля яны падстройваюцца пад іншых.

Дзень у важатага складаны. Ён пачынаецца ў 7 раніцы, а заканчваецца... Скажам так, дакладнай часавай мяжы ўвечары няма. Пад'ём у дзяцей — у 7.40. Разам з імі важатыя ідуць на зарадку, сняданак. Да абеду — гульні на свежым паветры: валейбол, піянербол, футбол, баскетбол... А яшчэ ідзе падрыхтоўка да самых разнастайных мерапрыемстваў. Напрыклад, у лагеры прайшла «Ноч музеяў». Кожная «дынастыя» прадстаўляла некалькі экспазіцый, якія ў пэўны момант ажывалі. Падчас «Легендаў музыкі» дзеці выступалі на балконах і спявалі легендарныя кампазіцыі Queen, Led Zeppelin, Beatles... Па мастацкай кнізе здымаем двухххвілінны буктрэйлер. А яшчэ прайшоў Дзень Гары Потэра, калі па лагеры бегалі 240 маленькіх чараўнікоў. Была і «Хвіліна славы», дзе кожны мог паказаць свае здольнасці.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Першыя тры дні, як правіла, дзеці прывыкаюць адзін да аднаго. Ім крыху складана звыкнуцца і з рэжымам дня, бо звычайна яны не праводзяць столькі часу на свежым паветры. Мабільныя тэлефоны выдаюцца толькі на «ціхай гадзіне», бо актыўны адпачынак не мусіць ператварацца ў «сядзенне ў смартфоне» пад дрэвамі.

А вось бацькі з дапамогай гаджэтаў могуць сачыць за тым, як іх дзеці пачуваюць сябе ў лагеры. Фота са шматлікіх імпрэз аператыўна выкладваюцца ў сацыяльных сетках.

Цікаўлюся ў Кацярыны Макаравай, што ж яе натхніла на такую цікавую, але даволі складаную працу.

— Дзеці — гэта закрытая кніга, якую хочацца раскрыць і пакінуць у ёй добры след. Малыя ж памятаюць свайго першага настаўніка, выхавацельку ў дзіцячым садзе... Быць для кагосьці прыкладам — гэта гонар для мяне.

А наколькі складана самім важатым працаваць учарашнім?

— Сярод нас ідзе раздзяленне паўнамоцтваў. Абавязкаў вельмі шмат: прыбраць у сталовай, накрыць стол, адвесці дзяцей на працэдуры, на спаборніцтвы па футболе, майстар-класы, прыдумаць праграму мерапрыемстваў... Да таго ж мы адмовіліся ад ідэі прапаноўваць мерапрыемствы дзецям «зверху», а прыдумляем іх разам. У нас няма паняцця «гуртковая работа», мы перайшлі на фармат майстар-класаў. Самы папулярны кірунак — танцы. Карыстаецца попытам і хэнд-мэйд, пачынаючы ад выбару чахлоў на тэлефоны і заканчваючы аплікацыямі ў 3D. Тыя, хто ўмее спяваць, рыхтуюцца да конкурсу па фармаце, падобным на «Еўрабачанне». Шмат падлеткаў задзейнічаны на сілавой аэробіцы. Адным словам, занятак па душы мы знойдзем кожнаму.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Сваімі рукамі

СТРОІ, ЯК У ПРОДКАЎ,

або Пад брэндам традыцый

Часам глядзіш на беларускі нацыянальны строй і нават крыху зайздросціш: якія ж былі ў нашых продкаў прыгожыя сукенкі ды кашулі! Вось бы мець нешта падобнае зараз... Чаму ж не? Ірына ПАЎЛОВІЧ, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, ужо некалькі гадоў займаецца вырабам народных строяў у шэрагу тэхнік: ткацтва, вышыўкі, вязання, пляцення і іншых.

— Мне заўжды было цікава ствараць нешта прыгожае і карыснае, спалучаць, канструяваць, увасабляць, нават калі вынік значна адрозніваўся ад пачатковай задумы, — расказвае дзяўчына. — Некалі я моцна захапілася жывапісам, але ўвесь час заставалася крыху незадаволеная тым, што выявы нельга выкарыстаць напоўніцу. Хацелася ствараць менавіта рэчы. Я доўга не наважвалася падысці да матэрыялу: ведаў і навыкаў, атрыманых на «працоўным навучанні» ў школе, не ставала.

«Саджуся «на гадзінку» пашыць і, канешне ж, раблю гэта даўжэй, да поўнага задавальнення ад зробленага, ахвяруючы іншымі не менш важнымі справамі».

Шмат чаго ў маім жыцці змянілася, калі я даведалася пра Студэнцкае этнаграфічнае таварыства. Пачала наведваць гурток «Шыем строй». Хацела стварыць для сябе адзенне на матыў з традыцыйнага Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, адкуль паходзіла мая прабабуля па матчынай лініі. Менавіта ў гуртку я навучылася разнастайным прыёмам, своеасаблівай логіцы традыцыйных рэчаў. Больш за тое, пазнаёмілася з сапраўднымі майстрамі і майстрыхамі, якім бязмерна ўдзячная за натхненне і навучанне і да якіх часам звяртаюся па параду. Мой строй быў гатовы ўжо праз паўгода, але, як аказалася, самае цікавае чакала мяне наперадзе.

— Можа, і адмысловыя прылады якія маеш?

— На лецішчы ёсць кросны, якія ўяўляюць сабой звычайны, былы ва ўжытку варштат пасляваеннай работы. Падчас экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства «Пружаны — Кобрын 2016» мясцовыя жыхары згадзіліся аддаць яго за вельмі сімвалічны кошт. Да гэтага за кроснамі я сядзела літаральна некалькі разоў, але ўжо паспела пранікнуцца прадуманасцю і прыгажосцю ручнога ткацтва. Сваякі падтрымалі маё памкненне і згадзіліся дапамагчы ў іх транспарціроўцы, за што я ім вельмі ўдзячная. Насамрэч, кросны сталі для мяне адным з самых каштоўных набыткаў.

— Табе ў рабоце хтосьці дапамагае?

— Непасрэдна рэчы я выраблю сама, але ёсць справы, якія самастойна не зробіш. Напрыклад, для якаснай запраўкі кроснаў — падрыхтоўкі іх да ткання — патрэбны два-тры чалавекі. Мне дапамагае маці, і гэтая справа займае ў нас звычайна некалькі дзён.

— Дзе чэрпаеш натхненне?

— Заўжды ёсць ідэі, якія чакаюць увасаблення, але, натуральна, з'яўляюцца яны на падставе чагосьці ўбачанага. Досыць вольна адчуваю сябе ў стварэнні «на матыў», іншымі словамі, часта раблю тое, што ўяўляецца менавіта мне, ніколі не імкнуся да дакладнай рэканструкцыі. Вялікім натхненнем для мяне застаюцца аўтэнтычныя вырабы і расповеды носьбітаў традыцыі. Калі падарожнічаю, як па Беларусі, так і па замежжы, заўжды наведваю этнаграфічныя музеі. Але ні адзін музей не заменіць гутарку з майстрамі сталага веку...

— Што для цябе самае складанае?

— Размяркоўваць час. Здараецца, што саджуся «на гадзінку» пашыць і, канешне ж, раблю гэта даўжэй, да поўнага задавальнення ад зробленага, ахвяруючы іншымі не менш важнымі справамі.

— Чаму, на тваю думку, так важна аднаўляць даўнія традыцыі?

— Па-першае, традыцыйныя рамёствы кіруюцца неверагоднай лагічнасцю і разумным выкарыстаннем матэрыялаў. Па-другое, шматлікія прыёмы і тэхнікі ўдала інтэгруюцца ў сучаснасць, пэўным чынам выпрацоўваюць непаўторны і пазнавальны стыль. Традыцыя — куды шырэйшая за арнаментаваную стужку, хочацца даносіць гэта праз рэчы, якія я раблю.

«Вялікім натхненнем для мяне застаюцца аўтэнтычныя вырабы і расповеды носьбітаў традыцыі».

— У якой тэхніцы больш за ўсё любіш працаваць?

— Па-шчырасці, займаюся толькі тым, што вельмі падабаецца. Падкрайное адзенне мае шмат цікавых вырашэнняў з пункту гледжання канструкцыі, раскройкі, стварэння сілуэтаў і выкарыстання дробных дэталяў. Вязаць пульсэткі, усыпаныя шклянымі перлінамі, проста вельмі прыемна. Акуратна і раўнамерна ставіць каляровыя штампы рознай формы, прыдумляючы спалучэнні і кампазіцыі, — неверагодна захапляльна. Пра ткацтва магу казаць бясконца, бо гэта праца, якая патрабуе высілкаў, часу, цярпення, прадумвання і некаторага «праграмавання» вынікаў, а адчуванне наяўнасці сваёй тканіны — неперадавальнае.

Апошнім часам заказы паступаюць усё часцей, чаму я вельмі рада: гэта магчымасць спрабаваць нешта новае.

— Плануеш развіваць свой асабісты брэнд?

— Натуральна, думаю працягваць працу, якая прыносіць шмат радасці, тым болей ёсць куды імкнуцца і чаму вучыцца. Паўнавартаснага камерцыйнага праекта пакуль не прыдумляла, але ўсё можа быць. Канешне, мару мець болей часу. Асабліва дзеля таго, каб паспець пазнаёміцца са сталымі майстрыхамі і майстрамі, пераняць традыцыю ад жывых носьбітаў і ўвасобіць яе ў сваёй творчасці — гэта, на маю думку, будзе самы каштоўны ўнёсак.

Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,
студэнтка III курса
факультэта журналістыкі БДУ.

Ідэі маладых

ПРА НАВУКУ ПА-БЕЛАРУСКУ? БЫЛО Б ЖАДАННЕ!

Аб'явамі аб адукацыйных імпрэзах зараз кагосьці здзівіць складана. Толькі каб наведаць навуковую лекцыю, на якой інфармацыя выкладалася б проста і, галоўнае, зразумела для чалавека любога ўзросту, трэба, каб моцна пашанцавала. А ці лёгка засвойваць навуку на беларускай мове? Спроба Анастасіі ПАЛТАРЖЫЦКАЙ ператварыць складанае ў даступнае і цікавае, а затым выкласці гэта па-беларуску вылілася ў праект «Навука на балоце».

Два гады таму, яшчэ будучы студэнткай БДУ, дзяўчына разам з сябрам вырашыла знаёміць людзей з фізікай. Дамовіліся: дзяліцца інфармацыяй будуць у выглядзе лекцый. Пасля перамоў з адной інтэрнэт-кампаніяй, якая дазволіла правесці мерапрыемствы на іх пляцоўцы, дзяўчына пачала рыхтаваць тэарэтычны матэрыял. Цудоўна памятае: тэма датычылася малекулярнай фізікі. На другую сустрэчу быў запрошаны работнік музея, які паказваў доследы з вадкім азотам. Пачатак праекта прыйшоўся на вясну, у той час сябры правялі толькі некалькі лекцый.

— А потым распачаўся новы сезон. Сярод тэм у нас была электрычнасць, астраномія. Расказвалі нават пра генетыку. Прывозілі прыборы з лабараторыі, глядзелі на Месяц праз тэлескоп з вуліцы. Сапраўды, шмат усяго было..., — успамінае Анастасія. — Асабліва спадабаліся лекцыі па генетыцы, разлічаныя на больш дарослую аўдыторыю, ды і лектар добра падрыхтаваўся.

Дзяўчына расказвае, што знайсці лектара — задача няпростая, бо трэба, каб у чалавека было не толькі жаданне расказаць, але яшчэ і здольнасць данесці інфармацыю папулярна на беларускай мове. Схема «падслухаў — расказаў» працуе тут на ўсе сто: часам толькі праз знаёмых можна знайсці тых, хто пагодзіцца бясплатна патраціць свой час. Аднойчы запланаваная лекцыя па філасофіі адмянілася, таму што запрошаны лектар прызнаўся: «Я не змагу расказаць даступна!» Здараюцца і цяжкасці з перакладам. «Але калі патрабуецца дапамога, я заўсёды гэта раблю», — дадае Анастасія.

Па словах арганізатара, на простыя тэмы яна запрашае сяброў са старэйшых курсаў. На сустрэчах навучаюцца ўсе: для лектараў таксама карысная работа з аўдыторыяй.

Сама імпрэза складаецца з некалькіх частак: прэзентацыя тэмы, гульні з аўдыторыяй, а другая частка — практычная.

— Верагодна, было б прасцей рыхтаваць матэрыялы па-руску. Чаму вырашылі выкарыстоўваць беларускую мову?

— Я была яшчэ малая, калі мяне прывялі ў суполку, дзе захапляліся беларускамоўнымі настольнымі гульнямі. Там і пазнаёмілася са сваім сябрам. Ён прапанаваў зрабіць нешта на мове. Я падумала пра лекцыі. Вось так і з'явілася «Навука на балоце». Праўда, цяпер працую адна, бо ў сябра з'явіўся ўласны праект.

Дарэчы, лекцыі цалкам некамерцыйныя, бо знайсці спонсараў не так проста. Затое актыўнасць абавязкова заахвочваецца яблыкамі. Анастасія кажа, што калі іх не застаецца, гэта значыць адно — сустрэча сапраўды атрымалася.

— Мне падабаецца, што лекцыі наведваюць і дзеці з бацькамі, і студэнты, і людзі больш сталага ўзросту. Слухаюць, падказваюць, спрабуюць размаўляць на беларускай мове, — кажа дзяўчына.

Звычайна атмасфера на пляцоўцы заўсёды цёплая, і на тое ёсць пэўныя прычыны: сюды прыходзяць людзі, якія чакаюць кожную лекцыю, таму Анастасія ўжо ведае многіх у твар. Кажа, што можа прыйсці 60 чалавек, а часам — усяго 10. Тлумачыць: «Усё залежыць ад тэмы».

Папулярызацыя навукі і беларускай мовы — менавіта так арганізатар вызначае мэту лекцый. На яе думку, мова павінна выкарыстоўвацца ва ўсіх сферах жыцця, таму дзяўчына імкнецца максімальна спрыяць гэтаму працэсу. Але займацца ўсім адной не так проста...

— Я хачу, каб праект дзейнічаў, таму што ён сапраўды файны, — тлумачыць Анастасія. — Калі да цябе прыходзіць выкладчык і пасля лекцыі кажа, што ўсё было крута, гэта ўзрушвае. Прыязджаў і мой сябра, што навучаецца ў Германіі ў аспірантуры. Ён падышоў пасля лекцыі і сказаў: «Насця, ты клёвая». Ведаеце, калі чуеш такую ацэнку сваёй працы, то хочацца рабіць. Яно тады і само робіцца.

Таццяна АШУРКЕВІЧ,
студэнтка II курса
факультэта журналістыкі
БДУ.

Вниманию акционеров ОАО «Элема» (г. Минск, ул. Тростенецкая, 5)!

Наблюдательный совет ОАО «Элема» доводит до сведения акционеров, что 17.08.2018 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элема».

– место проведения собрания – г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время начала собрания – 15.00;

– время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 14.00 до 14.50 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;

– время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 11.08.2018 г. по 16.08.2018 г., по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема» (приемная директора) с 9.00 до 15.00; 17.08.2018 г. – по месту проведения собрания с 9.00 до 15.00.

Орган общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров – наблюдательный совет, основание его созыва – собственная инициатива наблюдательного совета.

Повестка дня:

1. О выкупе акций собственного выпуска на баланс ОАО «Элема».

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 15.08.2018 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства, либо иной документ, подтверждающий его полномочия в качестве представителя.

Дополнительная информация по телефонам: + 375 29 332 72 91, + 375 17 364 73 09.

УНП 100074549

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА 18.09.2018
Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «Стройтрест – Холдинг»

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 700/С-14825 – мастерские, площадь – 462,0 кв. м, назначение – здание мастерских. **Капитальное строение с инв. № 700/С-14820 – столярный цех**, площадь – 150,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения. **Капитальное строение с инв. № 700/С-14819 – склад горючего**, площадь –73,0 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. **Капитальное строение с инв. № 700/С-14822 – мастерские по ремонту механизации**, площадь – 982,9 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), составные части и принадлежности: ограждение бетонное, ворота, эстакада, уборная. **Капитальное строение с инв. № 700/С-14821 – сторожевой пост,** площадь – 36,8 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: мощение асфальтобетонное. **Капитальное строение с инв. № 700/С-98643 – водопровод**, протяженность – 78,0 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. **Капитальное строение с инв. № 700/С-98641 – канализация**, протяженность – 59,8 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Объекты, входящие в состав лота № 1, расположены по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137б. Сведения о земельном участке: объекты, входящие в состав лота № 1, расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000003000214 (право постоянного пользования) площадью – 1,0100 га, назначение: содержание и обслуживание производственной базы СУ № 57, расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137б. **Обременения на объекты продажи:** арест (будет снят в случае продажи).
Начальная цена продажи: 227 159,25 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 22 715,93 бел. руб.

Продавец: ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «Стройтрест – Холдинг», УНП 700200537

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Дата, время и место проведения аукциона: аукцион проводится 18 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Прием заявок на участие: по 17.09.2018 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества: в течение 10 календарных дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %. Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (+375222) 72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-738-18-99

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ЗАО «Вирас», г. Минск, ул. Казинца, д. 64А, пом. 4Н, ком. 21
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер	Адрес
Административное помещение	368,1 кв. м.	500/D-708041786	**г. Минск, ул. Казинца, д. 64А-94**

Начальная стоимость без НДС – 245 500,00 бел. руб.
Шаг аукциона без НДС – 12 275,00 бел. руб.

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Пинчук С. Н., контактный телефон +375 29 623 32 40

Задаток 1 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.06.2018

Дата, время и место проведения электронных торгов: 27.08.2018 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае непрохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 24.08.2018 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

В связи с установлением фактов излишней уплаты страховых взносов по договорам добровольного страхования от несчастных случаев, ЗАСО «Дельта Страхование» проводит мероприятия по установлению подобных случаев и возврату излишне уплаченных страховых взносов лицам, их уплатившим

При подтверждении факта излишне уплаченного Вами страхового взноса, в соответствии с Гражданским кодексом Республики Беларусь, Вы вправе обратиться в ЗАСО «Дельта Страхование» за его возвратом.

Для рассмотрения вопроса о возврате излишне уплаченного страхового взноса направьте на наш адрес заверенные в установленном порядке копии имеющихся документов, подтверждающих данный факт.

Перечень прилагаемых документов не ограничен.

В случае обращения ранее Вами в судебные органы с целью взыскания задолженности по указанным договорам страхования направьте на наш адрес заверенные копии судебных документов (решений, судебных приказов, определений о судебном приказе и т. д.).

При отсутствии у Вас какого-либо подтверждения излишне уплаченных страховых взносов направьте нам сведения, подтверждающие Ваши взаимоотношения с ЗАСО «Дельта Страхование». По Вашей информации ЗАСО «Дельта Страхование» самостоятельно проведет проверку.

Претензии с копиями документов, подтверждающих заявленные требования, а также иные обращения необходимо направить почтой в ЗАСО «Дельта страхование» по адресу: 220079, г. Минск, а/я 267.

В претензии просим обязательно указать Ваши контактные данные: почтовый адрес, номер телефона, при наличии адрес электронной почты, банковские реквизиты для зачисления денежных средств, иные дополнительные сведения, которые считаете необходимыми.

По любому Вашему обращению будет проведена проверка и направлен мотивированный ответ по указанному Вами адресу. Более подробную информацию о возврате излишне уплаченных страховых взносов Вы можете узнать на сайте: www.acc.by в разделе «Новости».

УНП 100336711

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «Стройтрест № 1»!

Решением внеочередного общего собрания акционеров от 6 августа 2018 года были установлены:

– размер начисленных дивидендов за первое полугодие 2018 года на одну акцию;

– период выплаты дивидендов: до 24 сентября 2018 года;

следующий порядок выплаты дивидендов:

– на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Первомайского района;

– акционерам – физическим лицам – через депозитарий ООО «Совмедиа» почтовыми переводами.

УНП 100288960

21.08.2018 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О внесении изменений в решение общего собрания акционеров.
Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность). Дата сбора реестра 10.08.2018 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 10.08.2018 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Наблюдательный совет.

УНП 200050191

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Лот № 1. Гараж (здание специализированное автомобильного транспорта), общ. пл. **19,7 кв. м**, инв. № **700/С-90095**, по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, р-н пр-та Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 18**. Начальная цена с НДС 20 % – **3 063,37 бел. руб.**

Лот № 2. Квартира № 81, общ. пл. **63,2 кв. м**, инв № **500/D-592148**, по адресу: **г. Минск, пр-т Слободской, д. 18, кв. 81.** Начальная цена без НДС – **119 589,33 бел. руб.**

Лот № 3. Квартира, общ. пл. **74,3 кв. м**, инв. № **500/D-70591**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-2.** Начальная цена без НДС – **244 000,00 бел. руб.**

Лот № 4. Квартира 12, общ. пл. **67,8 кв. м,** инв. № **500/D-70611**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-12.** Начальная цена без НДС – **224 000,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона

Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия по Лотам № 3, № 4. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в г. «Звязда» 24.05.2018 г.

Дата и время проведения аукциона	**23.08.2018** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**21.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Торгтехника», г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корп. 1

Предмет аукциона
Месторасположение: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 31, пом. 2н

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Административное помещение	119,2 кв. м	500/D-7094523

Начальная цена с НДС 20 %	**116 160 долларов США** (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на момент оформления сделки купли-продажи)

Задаток 10 % по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**12.09.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**10.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

В связи с ликвидацией ОАО «Белстромремонт» (протокол № 2 общего собрания акционеров ОАО «Белстромремонт» от 10.07.2018 г. «О ликвидации ОАО «Трест Белстромремонт») первичная профсоюзная организация открытого акционерного общества «Трест Белстромремонт» прекращает деятельность.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220040, г. Минск, ул. Некрасова, дом 5, офис 512, тел. 399-21-19.

УНП 100799172

Летняя «Маладосць» працягвае вандраваць па далёкім і блізкім свеце — праходзіць вясковымі сцежкамі ў кампаніі Сыракомлі, падарожнічаць да Турцыі з Саламеяй Пільштыновай з Русецкіх, кідаць кароткія позіркі на Барселону і Рым, бадзяцца дарогамі Грузіі... Апошняе здзейсніў леташні дэбютант часопіса Аляксей Карпека. Тым часам калумністка часопіса Яна Мусвідас адкрыла для сябе Мінск, а Дзмітрый Шулюк, аўтар калонкі «Рубінавыя радкі»... выйшаў за межы сябе.

Дзмітрый ШУЛЮК

ЗА МЕЖЫ СЯБЕ

(Скарочана)

Да шаснаццаці гадоў я ніколі не быў за межамі роднай Смаргоншчыны. Усе падарожжы адбываліся на гэтым параўнальна невялікім лапіку зямлі і было іх няшмат. Раз на два-тры месяцы — у Смаргонь, раз на пяць гадоў — да родных у Кушляны, ці Залессе, ці Несцяняты, але часцей пад Дубатоўкі. Удзел у двух школьных паходах — у Плавушку і ў Сасноўку — вось і ўсе вандроўкі па маіх былых ваколіцах. Асобна трэба сказаць пра ровар. Ровар — адзін са стваральнікаў маіх першых вершаваных радкоў, адзін з найважнейшых элементаў мінулага, галоўны спадарожнік у першых падарожжах. Але напачатку роварам кіраваў тата.

Ад вёскі Сачаняты, дзе я правёў пакуль большую частку свайго жыцця, да раённага цэнтра ўсяго кіламетраў з дваццаць сем. І гэту дарогу тата не аднойчы адольваў на роварах. Часта я сядзеў на раме. Асабліва помніцца час, калі мама ляжала ў радзільні з маім малодшым братам Сашам. На працягу, здаецца, тыдня кожную раніцу мы ехалі да яе. Я тады хадзіў у школу ў другую змену і якраз паспяваў вярнуцца да пачатку заняткаў. Гэта быў вельмі добры час. Пасля ён часткова паўтарыўся. Толькі я ўжо не сядзеў на раме, а ехаў побач. На маім былым месцы сядзеў Саша.

Усё завяршылася, калі я скончыў школу і сваё жыццё ў Сачанятах з бацькамі. Толькі аднойчы на няпоўныя два гады вярнуўся, але не знайшоў нічога з таго, што пакідаў. Усё адно, што вярнуцца ў школу і паспрабаваць вучыцца далей па школьных правілах, увайсці ў тую ж раку праз дзесяцігоддзе, калі ад ракі застаўся адзін ручай, які бяжыць некуды імкліва...

Аднойчы з'ехаўшы са Смаргонскага раёна, я не магу супакоіцца і працягваю з'язджаць і ездзіць, жыць часова, гасцяваць, не пакідаючы «дому» нідзе. Магчыма, пазней, калі-небудзь. Пакуль што мне прыемней мець родныя кавалачкі паўсюль, чым адну мясціну-магніт, ад якой я не змагу адарвацца. Пакуль што я не хачу хапаць і трымаць, біцца за нейкае выпадковае сваё... Я ўжо ўбачыў, што межы патрэбна абмацваць са знешняга боку. Часцей за ўсё іх не існуе, гэта ілюзія, звычкі, таму і выходжу, выходжу, выходжу... У гродзенскай бальніцы, на львоўскай аглядавай вежы, у кіеўскім парку, у страдубскай школе, на полацкім чыгуначным вакзале я ёсць я, не больш і не менш, чым у любым іншым месцы. Я гатовы сяліцца там і жыць: тыдзень, месяц, год. Пакуль што мае сцены — гэта мая скура, мае вокны — мае вочы, мая печка — сэрца. Мне цёпла са мной. Толькі насамрэч усё куды больш складана...

Калі раптам хто з чытачоў не ведае, то трымайце навіну: я пішу прозу. Штосьці было надрукавана, штосьці не, сутнасць у іншым. У тым, што я пішу гэтую прозу толькі дзякуючы сваёй калонцы ў часопісе. «Толькі» — вельмі катэгарычнае слова, але ў гэтым выпадку да месца. Любы пісьменнік — жывы чалавек. Вакол яго вельмі шмат дробязяў, шмат асабістых праблем. І ён варыцца ва ўсім гэтым, прапітваецца, напаўняецца чужародным сочывам, якое немагчыма пасля, сеўшы пісаць, не выціснуць на старонкі. Дзіцячыя крыўды, спрэчкі з бацькамі, каханне — усё гэта прарывае любыя фільтры, прабівае любую агароджу і псуе тэкст. Псуе сваёй чужароднасцю. Псуе, бо мова мастацтва і мова жыцця — гэта розныя мовы. Уявіце: сярод музыкі Брамса раптоўна паўза і голас піяніста «я напісаў бы ўсё хутчэй і лепш, калі б вы мне не перашкаджалі», ці «Голад» Кнута Гамсуна, дзе той, разрывае форму, стыль і змест эмацыянальнымі зрывамі, пераключае камеру на сябе з галоўнага героя. Мне складана ўявіць. Нават «Уліс» Джойса. Джойс метадычна падае спасылкі нават на сваё жыццё і робіць гэта на працягу колькі гадоў. Прыгладжваючы ўсе вуглы, сінтэзуючы сваю біяграфію ў свае ж радкі. Не блытайце героя і аўтара, аўтару неверагодна шмат прыходзіцца рабіць, каб быць героем, але каб герой не быў аўтарам.

Калі ты не выходзіш з дома, ты не можаш выйсці з дома. Ты стаў яго часткай, а ён часткай цябе. Ніякіх падарожжаў больш не будзе. Ты будзеш сніць свае сны пра родную вёсачку і ў Парыжы, і ў Дубліне. Нават, пішучы раман-эпапею, ты не здолееш не згадаць, як табе неспраўядліва паставілі двойку.

Яна МУСВІДАС

ВАНДРОЎКА ПА РОДНЫМ ГОРАДЗЕ

(Скарочана)

ВАНДРОЎКА — вельмі шырокае паняцце. Яны бываюць кароткімі, а могуць доўжыцца гадамі. Некаторыя нічога не значаць, а нейкія змяняюць вас назаўжды. Можна падарожнічаць па розных гарадах, а можна — унутры сябе. Я лічу, што пакуль ты не знойдзеш гармонію з канкрэтным горадам, не палюбіш яго і не адчуеш сваю сувязь з ім, ты — турыст. Так, я доўгія дзесяць гадоў была турысткай у Мінску.

У маім пашпарце ў графе «месца нараджэння» — горад Брэст. Мне прыемны гэты факт. Не тое каб я вар'яцела ад горада ці хацела ў ім жыць, проста адчуваю з ім сувязь. Я не прэпарырую Брэст: не вылучаю ў ім плюсы і мінусы, а проста прымаю яго такім, які ён ёсць, — гэта мой родны горад.

З Мінскам адносіны складваюцца не так лёгка. Доўгі час ён здаваўся мне надта няўтульным, шырокім, шэрым, пустым. Я не магла палюбіць размашыстыя вуліцы, таталітарную архітэктуру і сумных людзей. Мне падабаўся толькі Верхні горад і больш нічога. Калі я была падлеткам, мне было неяк не да гармоніі з горадам. Не было сіл і часу, каб яго палюбіць.

Думаю, усведамленне, што я люблю Мінск, прыйшло толькі тады, калі я зразумела, што хутчэй за ўсё мне давядзецца яго пакінуць. Да гэтага я ніколі так выразна не бачыла, што ў нас столькі крутых гараджан, так шмат стыльных, прыгожых, цікавых, разумных людзей.

Каб любіць горад, не абавязкова ідэальна ведаць усе яго вулачкі, але вельмі важна разумець людзей. А я, як высветлілася, не ведала пра мінчан нічога. Сапраўдныя гараджане — гэта не тыя, хто ездзіць штодня да завода ці офіса і назад, з панурымі тварамі, а тыя, хто робіць Мінск лепшым. Гэта гарадскія актывісты, якія робяць жыццё мінчан больш камфортным і прыемным, смелыя рэстаратары, якія адкрываюць у Мінску модныя кавярні, рашучая моладзь, якая арганізуе свае фестывалі і фэсты. Менавіта гэтыя людзі ствараюць Мінск, рухаюць наперад урбаністыку. Бо так важна ўкладваць свае сілы не толькі ў свой дабрабыт, але і накіроўваць іх на карысць тых, хто побач. Гэта і ёсць сапраўдная любоў.

Так скончылася маё падарожжа па Мінску...

Аляксей КАРПЕКА

ДАРОГАМІ ГРУЗІНСКІХ БАДЗЯННЯЎ

Ўздоўж дарогі ад Тбілісі да Мцхеты і далей, ажно за Натахтары, рэжуць бараноў у Вялікую пятніцу. Рэжуць на месцы, нашто сантыменты. Сцэджваюць кроў, зразаюць шкуры, трыбушаць.

Пустыя голыя тушкі вісяць, чакаючы пакупнікоў, на перакладзіне, сімвалізуючы сабой канец Вялікага посту.

Пасля Зэстафоні дождж — густы, як добрае харчо. У дождж кіроўцы канчаткова вар'яцеюць. Людзі імгненна знікаюць з краявіду. Дождж змывае зімовы бруд і пыл. Усё вакол квітнее, снег саступае з гор.

Крывыя платы са старых дошак, іржавых сетак, лістоў металу ўздоўж дарог. Старыя аблезлыя сцены, цэгла абсыпалася, крывабока стаяць дамы.

Стомленасць, сон. Час застыў сярод тысячагадовых гор.

Адчуванне тленнасці фізічнага, матэрыяльнага.

Адчуванне часовасці ўсяго існага.

Тут мала хто сочыць за тым, як выглядае яго дом ды плот. Гэта ўсё — не важна. Бо жывучы тут, разумееш, што гэта ўсё часовае перад адвечнасцю гор.

Абшарпаныя хаты тонуць у квітнеючай зеляніне. Адзічэлыя схілы пагоркаў і горы навісаюць над імі.

У параўнанні з гэтымі пагоркамі дамы ўнізе, у даліне або на схіле ўстрымаюцца як часовае, сезоннае жыллё.

Яны раскінуты па схілах хаатычна, без якой-небудзь сістэмы.

Усюды адно і тое ж. У Натахтары, Пасанауры, Сачхерэ, Цаленджыха. Пасляпаўдзённая лянота, шклянка белага дамашняга віна, веранда, сад, крэслы і стол з пластыку, працёртае адзенне, стомленасць і абыякавасць на тварах, замызганы мясцовы бар, дзе наліваюць танны «Казбегі», ёсць папяросы «Пірвэлі», чача, хінкалі і лобіа.

Ім няма куды спяшацца. Заўтра будзе такі ж дзень, як і сёння. І пасля поўдня ўсё будзе гэтаксама.

Гэта вялікія гарады спяшаюцца, імчацца жыць, а тут час цыклічны, падпарадкаваны сезонам, ён нібы замкнуўся, прыняў форму, памёр, уваскрэс і ператварыўся ў вінаградную лазу.

Пакінутыя касматыя свінні гойсаюць у канавах ля дарогі або на палях уздоўж. Патлатыя каровы ляніва гуляюць па дарозе і па вузкіх вулачках вёсак, раптам застываюць на паўдарогі і глядзяць на цябе глыбокімі, як калодзежы, вачыма. Даводзіцца ім сігналіць, каб сышлі з дарогі.

Нічога не мяняецца гадамі. Гэта можа быць у Сванетыі, Самцхе-Джавахетыі, у Кахетыі або Гурыі, у Аджарыі ці Імерэтыі.

Шлях да Сванетыі доўгі. Надвор'е жудаснае ўсю дарогу. Холадна, дождж, вецер. Горы блішчаць, гарбатыя, як вярблюды, узвышаюцца — і ні да каго ім няма справы. Дарога перыядычна бывае завалена камянямі розных памераў. Часам даводзіцца спыняцца і прыбіраць іх, каб праехаць. Нізкія аблокі наравяць сарваць шапкі, а голыя дрэвы без сораму фарсяць галінамі.

У Местыі дождж, пустыя брукаваныя вуліцы. Гестхаўз у доме пажылой пары. Жудасны холад. Пакой у ружовых колерах, фіялетавыя шторы, і на кожнай сцяне алоўкам намаляваны крыж-абярэг. Верагодна, ад нячыстай сілы. З ацяплення толькі чэзлы абагравальнік, цяпло ад якога можна было адчуць, толькі дакрануўшыся да яго рукою.

У кавярнях пуста, і толькі ў адной поўна народу, там цёпла. Пахне грузінскай ежай. Сумесь спецый, свежых траў, мяса і здобы.

Гледзячы раніцай на горы вакол, разумееш, чаму для Сванетыі традыцыі вышэйшыя за закон. Закон сюды прыйшоў нядаўна, і што ён значыць перад старажытнасцю традыцый і гор, у асяроддзі якіх жылі продкі?

...Дзесьці на выездзе з Местыі, раніцай, мы варылі каву, гледзячы на горы і лес.

Удалечыні з гор спускалася рака. Побач пасвіліся коні.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
9 08 2018 г.

SEX-БАЛЯСЫ

ДЭФІЛЕ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ

Памятаеце ж нядаўнюю навіну пра тое, што арганізатары конкурсу «Міс Амерыка» прыбралі з яго праграмы дэфіле ўдзельніц у купальніках? Тое, што так падабаецца мужчынам і што выкарыстоўваецца ў якасці «цяжкай артылерыі» самімі прадстаўніцамі другой паловы чалавецтва. А ці не для гэтага відовішча «Міс Амерыка» калісьці і задумвалася? («Задача жанчыны — прыкрыць цела адзеннем такім чынам, каб яго было максімальна бачна».) «Мы больш не беззмястоўнае шоу, мы — спаборніцтва», заявіла кіраўнік апякунскага савета конкурсу. Во як! А мы ж да гэтага часу думалі, што і раней канкурсанткі менавіта спаборнічалі паміж сабой, дэманструючы грацыю, прыгожае дагледжанае цела, што, зразумела, без здаровага ладу жыцця і спорту за рэдкім выключэннем немагчыма. («Аказваецца, Даша, хадзіла не дарэмна. Вунь якія ногі накачала».)

Далей кіраўніца распавяла, што да іх паступала шмат зваротаў дзяўчат, якія вельмі хацелі б паўдзельнічаць у конкурсе, але, маўляў, не хочацца разгульваць на абцасах і ў бікіні. Гэта што — залішняя сціпласць ці нешта іншае? («Увогуле, я за здаровы лад жыцця, але ў мяне гнуткі графік».) Не хочаш хадзіць па сцэне ў купальніку, апранай робу і ідзі на прафесійнае спаборніцтва зваршчыкаў! («— Доктар, як хутка прыбраць жывот? — Павярніцеся спінай!») Што, несправядліва? А ці справядліва мяняць правілы пад сябе? («Бландзінка заходзіць у бібліятэку і звяртаецца да работнікаў: — Мне, калі ласка, каву і дзве булачкі. — Дзяўчына, што вы сабе дазваляеце?! Гэта ж — бібліятэка!!! — Вой, прабачце, (ужо шэптам) мне, калі ласка, каву і дзве булачкі!») Калі хочацца бліснуць найперш розумам і кемлівасцю — паўдзельнічай у інтэлектуальным конкурсе. І, як падаецца, арганізатары «Міс Амерыкі» з нейкіх прычын хочуць перавесці яго менавіта на гэтыя «рэйкі».

Замест дэфіле ў купальніках дзяўчатам трэба будзе гутарыць з членамі журы на самыя розныя тэмы. Прадэманстраваць, як той казаў, свой багаты ўнутраны свет. Думаеце, атрымаецца? («Калі лічыце, што вас кінулі, таму што вы занадта разумная, значыць, вы — дурніца».) Таксама канкурсанткі больш не будуць выходзіць у вячэрніх сукенках, а змогуць выкарыстоўваць тое адзенне, якое, на іх погляд, максімальна адлюстроўвае асабісты стыль. («Калі твая дзяўчына пытаецца, ці не тоўстая яна, максімальна хутка арыентуешся і: «Хто тоўстая? Ты тоўстая? Не смяшы мяне. Ты самая худая. Вось сяброўкі твае тоўстыя. Мае знаёмыя бабы таксама. Ды і сам я тоўсты. Але самая тоўстая — мая ранейшая. А ты не».) Згодна з новымі правіламі «Міс Амерыка» павінна прайсці ўжо ў верасні. І дарога туды адкрыецца абсалютна для ўсіх? Цікава, намінацыі ў конкурсе таксама зменяцца? («Не слухай іншых, дзяўчынка. Ты самая прыгожая. У сваёй вагавой катэгорыі».)

Ну ды бог з імі, гэтымі змяненнямі. Уласна, я нагадаў навіну пра «Міс Амерыка» вось дзеля чаго.

Літаральна некалькі тыдняў таму стала вядома, што ўпершыню ў гісторыі конкурсу каралевай прыгажосці стала... 60-гадовая ўдзельніца. Здавалася б... («У Адэсе: — Мадам, ды з вас ужо пясок сыплецца! — Зусім гэта не пясок... Гэта такі не згарэўшы ў маладосці порах».) Дык вось не! У конкурсе «Місіс Свету — 2018» пераможцам у такім паважаным узросце прызналі жыхарку Аўстраліі Робін Кэнер **(на здымку)**. («Патрабуем павысіць бальзакаўскі ўзрост для жанчын».) Калі яна падавала заяўку на ўдзел, сяброўкі круцілі пальцам каля скроні, маўляў, куды ты лезеш, на «Місіс Свету» спрабуюць прабіцца жанчыны ў раёне крыху за 30, у цябе няма шанцаў. Але ў выніку Робін абышла маладзейшых канкурэнтак, чый мінімальны ўзрост складаў 26 гадоў, і стала самай узроставай каралевай прыгажосці за ўсю гісторыю конкурсу. Вы ўяўляеце, як трэба было выглядаць, каб выйграць яго?! («Аб'ява ў адэскай газеце: «Жанчына ў самым саку шукае добрую сокавыціскалку».)

Безумоўна, справа была не толькі ў адной знешнасці. Хоць пагадзіцеся, найперш гэта прыцягвае ўвагу, асабліва на фоне заяў арганізатараў конкурсу «Міс Амерыка». («У свае 7.30 я выглядаю на 60».) Адзін з членаў журы потым сказаў, што пераможца скарыла суддзяў не толькі яркай знешнасцю і выхадамі на дэфіле (!), але і асабістым аповедам. («Кароткая пра сябе: гаспадарная, як мыла, простая, як аловак, ручная, як граната».) Не ўсё проста было ў жыцці Робін: памёр ад раку яе 22-гадовы сын... У нейкай ступені гэта і падштурхнула маці да ўдзелу ў конкурсах прыгажосці. Жанчына працуе фізіятэрапеўтам, супрацоўнічае з дабрачыннымі арганізацыямі і прыцягвае сродкі на даследаванне анкалогіі. Вось у каго багаты ўнутраны свет! («З узростам сумоўі ўсё больш нагадваюць вочныя стаўкі».) Сама Робін сказала, што конкурс даў ёй упэўненасць у сабе і апору, каб устаць і ісці далей. «Узрост — не кляймо. Нягледзячы на тое, што здарылася ў вас у жыцці, вы заўсёды можаце зрабіць нешта неверагоднае», лічыць «Місіс Свету — 2018». («Усё, што нас не забівае, можна яшчэ разок».)

...Гэтым летам у сеціве можна было ўбачыць здымкі многіх славутых людзей на адпачынку ў бікіні. 60-гадовай Шэран Стоўн, 71-гадовай Таццяны Васільевай, 82-гадовай Святланы Дружынінай... Іх фігурам можна было толькі пазайздросціць. А пра ўнутраны свет «зорак» мы ведалі і дагэтуль па іх творчасці. Вось гэта сапраўднае дэфіле!

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ДЫХАЕМ» З МУЖАМ АДНОЙ ТЭМАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Складана было запусціць уласны брэнд?

— Не тое слова. Калі пачыналі, было страшна, бо гэта скачок у невядомасць: атрымаецца ці не? Я разумела, што трэба будзе працаваць 24 гадзіны ў суткі без выхадных. Не толькі сядзець за машынкай — шукаць пакупнікоў, расказваць ім пра сваю прадукцыю. Спачатку я яшчэ шыла на заказ, але вырашыла адмовіцца ад гэтага, бо ў тых рэчах не было маёй ідэі — ты проста выконваеш пажаданні кліента. У выніку мы зрабілі невялікую калекцыю, зладзілі ёй прафесійную фотаздымку і выставіліся на маркеце (кірмашы дызайнераў. — **Аўт.**).

Тры гады мы нікуды не выязджалі, ва ўсім сабе адмаўлялі — усё ўкладалі ў справу. Але ведалі, на што ідзём. Ты павінен умець спраўляцца з праблемамі і, каб нечага дасягнуць, не сядзець і плакаць, а ісці наперад. Для нас самым складаным аказалася бухгалтэрыя — мы вырашылі, што лепш наняць прафесіянала, які будзе ёй займацца.

— Тое, што вы муж і жонка, дапамагае ў рабоце?

— Вельмі. Мы задаволены, што так здарылася. Мы «дыхаем» адной тэмай. Я не ўяўляю, каб у мяне муж быў нейкай іншай спецыяльнасці — наўрад ці ён бы так мяне разумеў. Сказаў бы: кідай гэта ўсё, ідзі на нармальную работу ці займайся домам. А так, калі нешта не атрымліваецца, мы пасмяёмся і супакоім адно аднаго: яшчэ заробім...

У нас падзел абавязкаў. Я адказваю за фасон і пасадку, Саша — за дэкор. Плюс муж займаецца дакументамі. Але тканіны выбіраем разам — у нас такія спрэчкі разгараюцца!

Адзін дзень у тыдзень — нядзелю — стараемся прысвяціць сабе. Ходзім у кіно, шпацыруем па парку, на веласіпедах катаемся, наведваем выстаўкі. Але ўсё роўна адкрываеш сацыяльныя сеткі і адказваеш на пытанні пакупнікоў: людзі чакаць не будуць.

— Якія з вашых рэчаў сталі самымі папулярнымі?

— Світшоты і сукенкі з саламяным конікам. Гэта вышыўка — народная любоў. Некаторыя купляюць і кажуць, што гэта траянскі конь *(усміхаецца)*.

— А як нарадзілася ваша калекцыя #Synoptik, прысвечаная беларускаму надвор'ю?

— Падчас тыдня моды мы паўдзельнічалі ў інсталяцыі, каб заявіць пра сябе, і выйгралі там грант ад кампаніі LG — тры тысячы долараў. Усе яны адразу пайшлі на тканіну: па ўмовах конкурсу мы павінны былі зрабіць калекцыю. Памятаю, у прэс-рэлізе былі радкі пра тое, што ранкам мы глядзім надвор'е і робім выснову, што сёння надзенем. Саша сказаў: «Вось гэта тэма». Пакупнікам калекцыя таксама спадабалася. Людзі вельмі палюбілі куртку з картай атмасферных франтоў.

Калекцыі распрацоўвае сямейны тандэм.

— Як часта абнаўляеце калекцыю?

— Цалкам — раз на паўгода. Плюс у прамежках выпускаем нейкія навінкі. Наогул фабрыкі рыхтуюць новыя калекцыі чатыры разы на год, але для гэтага патрэбны вялікі штат, які будзе адшываць усю лінейку адзення — курткі, штаны, блузкі. У нас такой задачы не стаіць: мы маленькая студыя і займаем сваю нішу.

— Аналізавалі, хто вашы пакупнікі?

— Гэта моладзь ад 25 гадоў. Але цікавяцца рэчамі і людзі ва ўзросце. На адным з маркетаў да нас падышла бабуля гадоў 80-ці. Прымерыла дажджавік і сказала: «Бяру». Спакойна аддала за яго 200 рублёў.

Раней мы рабілі і мужчынскія рэчы, але зразумелі, што трэба звузіць кірунак, бо не паспяваем адшываць і тое, і тое. Пакінулі толькі майку і світшот. Дый хлопцы, як правіла, не абнаўляць гардэроб так часта, як дзяўчаты.

— Вы сочыце за сусветнымі подыумамі?

— Абавязкова. Важна быць у трэндзе, бо можна захраснуць у сваім сусвеце, а ўсе пойдуць наперад. Для дызайнера дзіўна не глядзець паказы. Мы сочым за ўсімі брэндамі, бо галоўныя мастакі часта пераходзяць з аднаго моднага дома ў другі і за сабой перацягваюць стыль — за гэтым цікава назіраць.

Усе фабрыкі купляюць вялікія кнігі з трэндамі наступных сезонаў. Каталог дарагі, пад тысячу долараў, але інфармацыя ў ім каштоўная. Мы таксама стараемся абзаводзіцца трэндамі — у нас ужо ёсць тэндэнцыі на 2020 год.

— Ці бывае, што няма натхнення?

— Такое здараецца, калі вельмі стамляемся ад працы. Таму стараемся адключацца. Я прыходжу дадому і не думаю пра работу. З васьмі-дзевяці вечара не заходжу ў інтэрнэт — збіраю пазлы, чытаю, гуляю з катом, хаджу да сяброў у госці. Вось Саша не можа адключыцца — ён вельмі ідэйны.

«Я не ўяўляю, каб у мяне муж быў нейкай іншай спецыяльнасці — наўрад ці ён бы так мяне разумеў».

— Мінчан можна назваць моднікамі?

— Так. За апошнія тры-чатыры гады гараджане вельмі змяніліся. Можа, на гэта паўплывала адкрыццё новых крамаў — яны прывезлі моду. І гэта здорава. Знешні выгляд — таксама важны аспект. Ад гэтага залежыць і твой настрой, і як дзень пройдзе, і як акружэнне цябе ўспрыме. Што б ні казалі, а людзі заўсёды глядзяць на тое, у што ты апрануты.

— Напэўна, у дызайнера не бывае праблемы з выбарам убораў?

— Не. Прыходжу ў студыю і кажу: мая шафа *(смяецца)*. Я нашу адзенне толькі нашага брэнда. Ужо тры гады не набываю рэчаў — нават зімовы пухавік. Мы неяк шылі іх, адзін быў няўдалы — я яго сабе і пакінула.

— Каго хацелі б апрануць?

— Збіраліся гісторыку моды Аляксандру Васільеву дажджавік падарыць, калі ён на адкрыццё сваёй выстаўкі ў Мінск прыязджаў, але не паспелі... Наогул ёсць такі чалавек, якога хацелі б апрануць, — вельмі вядомы, жыве недалёка. Але пакіну імя ў сакрэце. Ён атрымае падарунак ад нас у верасні, няхай гэта будзе для яго сюрпрызам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота з архіва дызайнераў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.08.2018 г.

ЖНІВЕНЬ У СТАЛІЦЫ АЛЬМАНСКІХ БАЛОТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вёску Альманы называюць краем зямлі беларускай, бо з паселішча вядзе толькі адна дарога ў знешні свет: з паўднёва-ўсходняга боку падыходзіць памежная зона з Украінай, а з паўночнага ўсходу і ўсходу — бяскрайнія балоты. Балотны біятоп з'яўляўся неад'емнай часткай жыцця вяскоўцаў, надзейным сродкам выжывання палешукоў ва ўсе часы. Сёння таксама. За чарніцы ў гэтым годзе давалі даволі вялікія грошы — чатыры пяцьдзясят за кіло. Як толькі пайшлі першыя ягады, дарослае насельніцтва па традыцыі падалося ў лясы сярод балот. У жніўні — невялікая перадышка перад іншым ягадным бумам: журавіны яшчэ не паспелі. Больш спрытныя збіральнікі ў гэты час ходзяць па балоце, выглядваюць самыя ўраджайныя мясціны, плаваюць нават за Засамінае возера. Журавіны для альманцаў — сапраўдны кландайк. Таму ў светлы час сутак у вёсцы можна ўбачыць толькі пенсіянераў і дзяцей — як мясцовых, так і прыезджых.

Некалі меліяратары адваявалі ў балота вялікую плошчу і за Альманамі ва ўрочышчы Гачы з'явілася шчодрае хлебнае поле. На гэтым жніве працаваў і кіроўца МАЗа Рыгор Аглашэвіч — адзін з найлепшых кіроўцаў КСУП «Струга», якога я «заспеў» у кузаве з намалочаным трыцікале. На полі сустрэў галоўнага агранома гаспадаркі Марыю Завялаву з яе двайнятамі *(на фота)*. Сынок Саша і дачушка Ксенія так хацелі ўбачыць матулю, што прыбеглі за ваколіцу на «маміна» поле.

Цяпер у вёсцы пражывае 150 сем'яў, у якіх гадуюцца 287 дзяцей. За апошні год у сталіцы Альманскіх балот нарадзілася 7 дзяцей. А ў 1971 годзе ў Альманах з'явіліся на свет семдзесят (!!!) немаўлят. Але гэта быў пік нараджальнасці... У няспешнай экскурсіі па альманскіх вуліцах гэтым разам мне сустрэліся людзі з пазітыўнымі і настраёвымі тварамі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
Столінскі раён.

Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by.

■ Скарбы малой радзімы

ЭКСПАНАТЫ АД ДАРАГАНАЎ

Гэты род шмат чаго зрабіў для Асіповіцкай зямлі. Дзякуючы Восіпу і Мацвею Дараганам у канцы XIX стагоддзя тут была пабудавана ўнікальная чыгуначная ветка ад Асіповіч да Старых Дарог, вопыт пабудовы якой потым распаўсюдзілі па ўсёй Расійскай імперыі.

Акрамя гэтага тут з'явіліся дзве станцыі, масты і шмат чаго сучаснага на той перыяд, што зрабіла Дараганава вельмі перспектыўнай вёскай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі гэты род пераехаў за мяжу і сувязь надоўга абарвалася. Некалькі гадоў таму яна была адноўлена, і ў раён прыехаў са Швецыі праўнук Восіпа Дарагана Андрэй разам са сваёй жонкай Ланай. Дзякуючы ім, раённы музей атрымаў багатую калекцыю прадметаў і дакументаў славутага роду. Для іх размяшчэння былі выдзелены пяць залаў у шматпрофільным маладзёжна-падлеткавым цэнтры «Равеснік». Нядаўна сужэнцы зноў наведалі раён, у выніку чаго калекцыя музея папоўнілася яшчэ больш чым сотняй новых экспанатаў, а Свята-Панцеляймонаўская царква ў вёсцы Дараганава — фамільнымі абразамі сямейства.

— Гэта была па-сапраўднаму цёплая сустрэча, — адзначыла **дырэктар раённага гісторыка-краязнаўчага музея Антаніна СЦЯПАНАВА.** — Прыязджалі таксама бацькі Ланы Дараган, якія жывуць у Таліне, госці з музея флоту Санкт-Пецярбурга. Частку экспанатаў Андрэй у свой час перадаў і туды. Зараз ён з жонкай прывёз шмат дакументаў і сямейных фота, некаторыя прадметы быту, жаночыя аксесуары. У гонар гэтай сустрэчы ў залах экспазіцыі роду Дараганаў адбыўся святочны баль. Андрэй прызнаўся, што адчувае сябе на радзіме продкаў як дома. І гатовы сюды вяртацца яшчэ не раз.

Раён арганізаваў для Андрэя і Ланы экскурсію па мясцінах, звязаных з жыццём і дзейнасцю Дараганаў. Яны наведалі храм і святую крыніцу ў Прошчы, школьны музей у аграгарадку Дараганава, вёску Крынка, дзе раней знаходзіўся маёнтак Восіпа Дарагана. Але асабліва сужэнцы радаваліся сустрэчы з тымі людзьмі, якія за гады знаёмства сталі ім амаль роднымі. Шмат чаго для вяртання гістарычных каштоўнасцяў на радзіму зрабіла былая дырэктар школьнай музея ў Дараганаве Жанна Караленя. Гэта менавіта дзякуючы ёй была адноўлена сувязь з нашчадкамі знакамітага роду і завязалася доўгатэрміновае плённае супрацоўніцтва. Андрэй і Лана вельмі цёпла адносіліся да Жанны Сямёнаўны. На жаль, гэтым разам сустрэцца ў яе з гасцямі не атрымалася. Вясной таленавітай настаўніцы і шчырай жыццялюбкі не стала — яна заўчасна пайшла з жыцця пасля працяглай хваробы.

Нэлі ЗІГУЛЯ

Пра ліхія 90-я

Летась 9 жніўня «Звязда» адзначыла свой стагадовы юбілей. На працягу ўсяго года на старонках найстарэйшага штодзённага беларускамоўнага выдання мы згадвалі розныя гістарычныя перыяды жыцця як краіны, так і самой газеты. І вось «Звязда» адзначае ўжо 101-ю гадавіну з дня свайго заснавання. Як хутка бяжыць час... Сёння, нібыта завяршаючы гэтую стагадовую «эстафету», мы прапануем чытачам вярнуцца ў 1990-я, прыгадаць, якім тады было жыццё, што было на слыху... Як даўно гэта было... Зрэшты, калі ўдумацца, на фоне 101-й гадавіны «Звязды» тыя падзеі — не такія ўжо і далёкія... Хоць змянілася ўсё кардынальна, і ўявіць штосьці падобнае сёння даволі складана.

■ Як гэта было

«Запэўніванні намесніка міністра на батон не намажаш...»

Пад такім загалоўкам 13 лістапада 1996 года ў «Звяздзе» выйшла мая заметка з прэс-канферэнцыі тагачаснага міністра гандлю Пятра Казлова ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Пачыналася яна так. «Тэма забеспячэння насельніцтва харчовымі таварамі стала ў апошні час цэнтральнай практычна для ўсіх сродкаў масавай інфармацыі, не гаворачы ўжо пра мясцовыя і нават вярхоўныя ўлады. Як вядома, заўчора Прэзідэнт краіны наведаў шэраг магазінаў, каб самому пераканацца ў тым, якім жа чынам задавальняюцца патрэбы насельніцтва ў плане забеспячэння харчовымі таварамі. Гэтай жа тэме была прысвечана і сустрэча міністра гандлю Пятра Казлова з журналістамі...»

Тэма дэфіцыту ў тыя часы была сапраўды надзвычай актуальная. Я з Міністэрства гандлю практычна не вылазіў, беручы бясконцыя каментарыі ў яго работнікаў, адпаведна, быў у іх вачах (гэта было відаць) асобай не вельмі жаданай. Пра што тады пісала «Звязда»? Мяркуйце па загалоўках. «Чорны» тыдзень у Мінску: «абвал» цэнаў» (18.07.1996), «У Беларусі зрушылі з месца цэны на нафту і нафтапрадукты» (13.09.1996), «Гарэлка «ўзяла» новую цану» (22.11.1996), «Мяккае» павелічэнне цэн: зноў падаражэла гарэлка» (04.12.1996), «У Беларусі павялічаны кошт нафты і прадуктаў яе перапрацоўкі» (07.12.1996), «Гандаль харчаваннем: пакуты — круг другі?» (11.12.1996), «Услед за доларам у краіне знікае маргарын» (12.12.1996), «Куды знікаюць прадукты?» (17.12.1996), «Са смятанай будзем не раней студзеня» (18.12.1996)... Такія нярадасныя навіны з'яўляліся літаральна штодня на працягу доўгага часу, гэта прыклады за невялікі яго прамежак...

Паколькі каментарыі афіцыйныя асобы давалі не вельмі ахвотна, было шмат чутак. Я вёў у «Звяздзе» адпаведную рубрыку, якая так і называлася — «Ходзяць чуткі, што...». Яна таксама з'яўлялася на старонках газеты ці не штодня. Пра што хадзілі чуткі? Што падаражэе збожжа сёлетняга ўраджаю (19.07.1996), падаражэе белая гарэлка (18.07.1996), у краіне не хапае цыгарэт (07.08.1996), у магазінах не хапае хлеба (03.10.1996), Беларусь застанецца на зіму без мяса (15.08.1996), з-за недахопу масла яго размяркоўваюць па картках (01.11.1996)...

На апошняй тэме хачу спыніцца больш падрабязна. Адсутнасць масла ў продажы бачылі ўсе, пра што нам рэгулярна паведамлялі чытачы. І вось аднойчы намеснік міністра гандлю, відавочна даведзены да шаленства маімі запытамі, прапанаваў разам на яго «Волзе» пад'ехаць у любую краму сталіцы і праверыць наяўнасць гэтага прадукту на паліцах. Гандлёвы аб'ект для чысціні эксперымента (маўляў, каб не казаў потым, што масла туды спецыяльна для візіту завезлі) намеснік міністра гандлю прапанаваў выбраць мне. Я паказаў на буйную краму побач з месцам, дзе мы на той момант здымалі з жонкай кватэру. Селі ў «Волгу», паехалі... Дарэчы, дарогай я даведаўся ад суразмоўніка яшчэ адну прычыну адсутнасці ў гандлі гарэлкі. Аказваецца, усё было з-за таго, што белая — «такі ж харчовы прадукт, як і іншыя». Я так, памятаю, сабе адразу ўявіў карціну: прачынаецца ранкам чалавек, а масла на ранішні бутэрброд няма. І што рабіць? Дык можна ж паснедаць чаркай-другой! Жартую, вядома.

А масла ў той краме на момант нашага наведвання ў продажы было. Звяртаю ўвагу на гэты момант. Не таму, што падазраю некага ў спецыяльным завозе, не, проста канстатую. Зразумела, што гэты харчовы прадукт у прынцыпе не знік з прыроды. Але мы былі ўдзень у гандлёвым аб'екце, калі яго маглі купіць найперш пенсіянеры, а вось увечары, калі рабочы чалавек вяртаўся дадому, масла ўжо магло і не быць. У прынцыпе, пра гэта я і гаварыў намесніку міністра, тлумачачы скаргі ад чытачоў. Журналіст — люстэрка рэчаіснасці, ён падае тое, што бачыць на свае вочы. І калі па першым часе чыноўнік падазраваў ува мне нейкую перадузятасць, магчыма, жаданне знайсці «смажаныя» факты, дык потым крыху змяніў стаўленне. Калі мы вярнуліся ў яго кабінет, нават падарыў уласны тэлефонны даведнік па міністэрстве...

А праз некалькі дзён на маё імя прыйшло чарговае пасланне ад чытача. Нават не ліст, а зусім простая, нават без малюнка, паштоўка. Яна і зараз захоўваецца ў маім архіве. В. Фрыгін з Магілёва пісаў: «Сёння, як і некалькі вечароў запар, зайшоўшы ў шэраг магазінаў (у асноўным — Ленінскага раёна), не змог купіць масла. Адкрыўшы дома «Звязду», прачытаў, што, па словах намесніка міністра Еўтухоўскага, масла ў Магілёве ёсць. Але яго запэўніванні на хлеб не намажаш, таму прыйшлося браць маргарын Rama па 50 тысяч рублёў за кілаграм...»

...Праз нейкі час на сустрэчы ў рэдакцыі з ветэранамі газеты адна з былых нашых супрацоўніц пры ўсіх прысутных сказала: «Пакажыце мне гэтага Расольку! Ён увесь час піша пра цэны і прадукты. Няўжо такі галодны?!» Гэта быў жарт, а вось афіцыйныя асобы далёка не ўсе разумелі неабходнасць аператыўнага рэагавання праз каментарыі на чуткі. Як і таго, што гэта праца журналіста. Тым больш што ніякай Амерыкі мы не адкрывалі. Напрыклад, у тагачаснай Чэхіі, якая сутыкнулася з тымі ж праблемамі, што і наша краіна, пражскія газеты не саромеліся змяшчаць інфармацыю пра тое, дзе можна танней набыць у горадзе яйкі ці карпа да каляднага стала. Проста час быў такі...

ТЫФ У ГОРАДЗЕ

У канцы 1996 года ў краіне адбыўся неардынарны выпадак. Напачатку ў Чэрвені была зафіксавана ўспышка брушнога тыфу, затым ён трапіў у Барысаў. Гаворка ідзе пра хваробу, аб якой многія з сучаснікаў нават і не чулі... «Звязда» адной з першых пачала падрабязна асвятляць ход падзей...

Першая публікацыя называлася «Брушны тыф у Чэрвені: мноства захварэўшых, факт самагубства, парушэнні ў гандлі», якая стала вынікам камандзіроўкі на месца падзей.

Усё пачалося на тэрыторыі дома-інтэрната для псіханеўралагічных хворых, дзе трактар разбурыў «аглядны калодзеж на выхадзе каналізацыйнага калектара ад ізалятара бактэрыяносьбітаў». На грунт трапілі сцёкавыя воды. А пацыенты інтэрната елі яблыкі, якія з дрэва трапілі ў гэтую ваду, мылі ў ёй абутак...

Пры ўспышцы тыфу была забаронена рэалізацыя прыватнага малака, у якое магла трапіць інфекцыя, і крэмавых вырабаў, бо яны — найлепшае асяроддзе для ўзбуджальніка хваробы. Аднак журналіст «Звязды» зафіксаваў парушэнне і першай, і другой забароны. Прыватнікі прадавалі свежае малако, а ў кулінарыі побач з рынкам у вітрыне красаваліся свежыя тарты, у цэху на стале ляжалі конусы з крэмам. Давялося потым вяртацца да парушальнікаў ужо з супрацоўнікамі міліцыі.

...Пасля наведвання дома-інтэрната ўрач параіў добра памыць рукі, бо пры тыфе гігіена павінна быць на першым месцы. Па стане на раніцу 11 лістапада ў інфекцыйным аддзяленні гарадской бальніцы знаходзіліся ўжо 39 чалавек — хворых з дакладным дыягназам і падазрэннем на тыф, а ў самім доме-інтэрнаце — 54 чалавекі. Медсястра, якая знаходзілася ў ліку падазраваных, самавольна пакінула бальніцу. Жанчыну знайшлі праз некалькі дзён за горадам — у пятлі...

Наступны матэрыял называўся «З Чэрвеня брушны тыф трапіў у Барысаў». Справа ў тым, што аднаго з пацыентаў маці забрала з дома-інтэрната для псіханеўралагічных хворых дадому: у 30-гадовага мужчыны быў дзень нараджэння. Ноччу яму стала дрэнна, ён страчваў прытомнасць. Дыягназ «тыф» паставілі не адразу. Хворы трапіў у асобны бокс Барысаўскай інфекцыйнай бальніцы. Маці знаходзілася побач з сынам...

Праз два тыдні гісторыя атрымала працяг — «Брушны тыф у Барысаве: новая ахвяра». Падазрэнні ўзніклі ўжо ў дачыненні да жанчыны — маці пацыента з Чэрвеньскага дома-інтэрната для псіханеўралагічных хворых. На той момант там гаворка ўжо ішла пра магчымых (канчаткова кропкі над «і» ставіць было яшчэ рана) 74 хворых на брушны тыф, з якіх 10 чалавек былі бактэрыяносьбітамі.

У пачатку снежня неафіцыйныя і афіцыйныя звесткі з двух гарадоў зноў паклікалі ў камандзіроўкі ў Чэрвень і Барысаў — «Гісторыя з брушным тыфам: канкрэтных вінаватых пакуль няма, а колькасць захварэўшых вымяраецца дзясяткамі». На той момант у інфекцыйным аддзяленні бальніцы ў Чэрвені знаходзілася 33 чалавекі, у ізалятары дома-інтэрната — 79 (з падазрэннем на тыф ці ўжо з дыягназам). За лістапад — кастрычнік у справаздачу была пададзена лічба 78 чалавек: менавіта столькі за гэты час было пастаўлена дакладных дыягназаў «брушны тыф». У іх ліку было сем чалавек медперсаналу, астатнія — пацыенты дома-інтэрната. У снежні новых выпадкаў захворванняў устаноўлена не было. Сын медсястры, якая скончыла жыццё самагубствам, звяртаецца ў пракуратуру са скаргай, у якой сцвярджае, што яго маці давялі да такога кроку...

Еду ў Барысаў. Маці пацыента з Чэрвеньскага дома-інтэрната дыягназ не пацвердзілі. Але яна па-ранейшаму знаходзіцца побач з сынам у адным боксе, даглядае яго. Пасля размовы з медперсаналам бальніцы вырашаю яе наведаць.

«Асобны бокс з падвойнымі дзвярыма. У невялікім пакоі на ложку сядзіць жанчына, каля сцяны пад коўдрай спіць яе сын. У вачах — стома. Вядома, такое вытрымаць...

— Як вы сябе адчуваеце?

— Ужо лепш, ды і сын пачаў уставаць з ложка, а то месяц ляжаў...»

У канцы размовы жанчына дзякуе, кажа, што пасля публікацыі ў газеце на верталёце прылятаў прафесар. На вачах у яе наварочваюцца слёзы...

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Чулі?!

Экстрэмальная спякота: ужо не сцэнарый аддаленай будучыні, а рэальнасць

Экстрэмальныя ўмовы надвор'я, уключаючы рэкордна высокія тэмпературы, засуху і інтэнсіўныя ападкі, якія сёлета назіраліся ў Паўночным паўшар'і ў першай палове лета, неўзабаве стануць звычайнай з'явай. Да такой высновы, піша БелТА, прыйшлі эксперты Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА), паведамляе Радыё ААН.

Фота БелТА.

«2018 год, магчыма, стане самым гарачым за ўсю гісторыю. У многіх краінах устаноўлены новыя тэмпературныя рэкорды. Гэта не дзіўна. Гарачае надвор'е і вельмі высокія тэмпературы, якія мы назіраем цяпер, адпавядаюць нашым прагнозам ва ўмовах змены клімату, выкліканай парніковымі газамі. Гэта не нейкі сцэнарый будучыні. Гэта адбываецца проста цяпер», — заявіла **намеснік генеральнага сакратара СМА Алена МАНАЕНКАВА.**

Эксперты СМА адзначаюць, што надвор'е аказала велізарны ўплыў на здароўе людзей, сельскую гаспадарку і інфраструктуру. У глабальным маштабе цяперашні чэрвень быў другім самым гарачым чэрвенем за ўсю гісторыю. Спякота не адыходзіла і ў ліпені, і ў жніўні, прычым нават на поўначы. Небывалае спякотнае надвор'е пачынаючы з сярэдзіны ліпеня ўсталявалася ў скандынаўскіх краінах. За Палярным кругам тэмпература паветра перавысіла плюс 30 градусаў. У Фінляндыі гэты ліпень стаў самым гарачым за ўсю гісторыю, пры гэтым спякоту суправаджала засуха, у выніку якой чакаюцца страты да 50 % ураджаю. Сёлета ад засухі пацярпелі таксама Ірландыя, Германія і Францыя.

ДАРЭЧЫ

Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў краіне на сёння з-за спякоты, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Будзе пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. У начны і ранішні час месцамі чакаецца слабы туман. Вецер паўднёва-ўсходні, паўднёвы, 3—8 м/с, удзень па захадзе краіны парывы дасягнуць 12 м/с.

Тэмпература паветра ўначы складзе ад 10 па паўночным усходзе да 18 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны, удзень — 25—30 вышэй за нуль, па паўднёвым захадзе — да плюс 32.

Маштабныя разбурэнні прынеслі і лясныя пажары. Гэтым летам яны ахапілі Швецыю, Іспанію, Партугалію і Грэцыю, дзе ў некаторых месцах тэмпература падымалася да 46,6 градуса. Незвычайна высокія тэмпературныя паказчыкі зафіксаваныя ў паўночнай Сібіры, паўсюль у ЗША, цэнтральнай Канадзе і на поўначы Афрыкі, Блізкім Усходзе і на поўначы Кітая.

У Парыжскім пагадненні па клімаце пастаўлена задача не дапусціць павелічэння сярэдняй глабальнай тэмпературы больш чым на 1,5-2 градусы па Цэльсію. Аднак, па словах прадстаўніка Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі Майкла Спэрау, і гэтыя меры не дапамогуць скараціць выкіды парніковых газаў. «Нават калі краіны зробяць захады, неабходныя для таго, каб утрымаць павышэнне тэмпературы на ўзроўні двух градусаў або ніжэй, існуе імавернасць, што механізмы, якія кампенсуюць эмісіі парніковых газаў, такія як акіяны і лясы, што паглынаюць вуглякіслы газ, перастануць працаваць і будуць спрыяць далейшаму значнаму пацяпленню», — адзначае Майкл Спэрау

«Нам засталася спадчына...»

Шыльда.

Што ёсць сёння?

Старажытны шляхецкі комплекс некалькі гадоў таму набыў на аўкцыёне расійскі бізнесмен з беларускімі каранямі Павел Падкарытаў. Кажуць, што ён вельмі зацікавіўся гісторыяй мясцовай эліты і нават вывучыў беларускую мову. Але ўсімі работамі кіруе яго даверaная асоба, мясцовы навуковец, гісторык і педагог Андрэй Колас. Ён расказаў, што маёнтак, хоць і налічвае больш за 500 гадоў, неаднаразова разбураўся і быў амаль поўнасцю адбудаваны ў XIX стагоддзі апошнім уладальнікам Янам Ота Бохвіцам, лёс якога трагічна завяршыўся напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пры ім з'явіліся другі паверх і бакавыя пакоі. Велічны маёнтак атрымаў назву «Фларыянова» ў гонар бацькі гаспадара — вядомага на той час філосафа і педагога Фларыяна Бохвіца, які напісаў некалькі фундаментальных філасофскіх і педагагічных твораў аб выхаванні і пачуццях.

Падчас Першай сусветнай вайны маёнтак быў спалены і адсюль усё павыносілі, засталіся толькі сцены. У савецкі час тут была школа, а затым калгасная кантора. Флігель аддалі пад кватэры, але дом прызналі аварыйным і жыхары з'ехалі. У такім прыблізна стане сядзібны комплекс быў выкуплены.

Трэба сказаць, што ён нейкім чынам амаль поўнасцю захаваўся. Асабліва ўражвае велічная брама, якая вядзе да радавога гнязда. Праўда, уваходная група зараз у будаўнічых рыштаваннях, ідзе кансервацыя той часткі брамы, якая крыху разбурана. Яе замацуюць і раскрыюць, кажа Андрэй Колас, бо брама з'яўляецца свайго роду візітоўкай сядзібы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама на тэрыторыі часткова захавалася старая стайня і будынак былой кузні. Нельга не адзначыць і ўтульную паркавую зону з клёнамі і ліпамі. З больш рэдкіх парод — явар, чорная карэльская бяроза, амерыканская ліпа. Усяго каля 500 дрэў, з іх па праекце трэба захаваць 370. Дрэвы маюць па 80—100 гадоў. Суразмоўнік запэўніў, што секчы старыя дрэвы пакуль не маюць намеру. У парку пракладуць сцежкі і трохі акультураць.

Андрэй КОЛАС каля будучага кафэ.

Кавярня ў былой стайні

Паколькі комплекс лічыцца гісторыка-культурнай спадчынай, работы праводзяцца па ўзгадненні з Міністэрствам культуры. Рэстаўрацыя вядзецца ў тры этапы.

Напачатку адновяць старую кузню, дзе размесціцца сувенірная крама. Зараз тут аздабляецца памяшканне, выкладваецца плітка. Увосень завязуць абсталяванне і адкрыюць краму для турыстаў.

Завяршаюцца работы на рэстаўрацыі былой стайні, дзе ў савецкі час былі гаражы. Цяпер уласнікі распрацавалі праект пад кавярню, разлічаную на 24 наведвальнікі. Аб'ект даволі цікавы — сучасны модуль «уціснуты» ў старажытныя руіны. Фундамент умацаваны вялікімі камянямі. Будаўнічыя работы тут завершаны, засталося толькі аздабленне і добраўпарадкаванне.

Побач з «зімовай» кавярняй узведзена летняя тэраса на 100 пасадачных месцаў. Здалёк гэты аб'ект можна прыняць за старажытны. Аказалася, што трывалы драўляны навес з доўгімі сталамі і лаўкамі — навадзел і пабудаваны летась. Але сапраўды, наўрад ці драўляная тэраса захавалася б да гэтай пары.

Між іншым, на тэрыторыі комплексу знаходзіцца даваенная альтанка, таксама драўляная. Вакол яе было шмат спрэчак. І хоць яна не лічыцца гістарычнай каштоўнасцю, гаспадарам неабходна адрамантаваць яе ў адпаведнасці з мінулай эпохай, а работы ўзгадняць з Мінкультам. Мяркуецца, што да восені альтанку адрамантуюць, а ўжо налета ўсе рэсурсы плануецца кінуць на гасцініцу.

Музей і постаць Наполеона

За дзясяткі метраў ад палаца стаіць былы флігель, у якім жылі слугі, а на другім паверсе — аканом, ці, як кажуць цяпер, — загадчык гаспадаркі. Будынак не мае ніякіх архітэктурных асаблівасцяў, але пасля рэканструкцыі набудзе больш прэзентабельны выгляд. Тут з'явіцца гасцініца на 28 месцаў. Затым дойдзе чарга да самога маёнтка і парка. Прыкладная дата — 2020 год. Тэрміны адцягваюцца з-за розных праектных акалічнасцяў.

Андрэй Колас праводзіць па былых пакоях маёнтка, якіх тут налічваецца 27. У большасці меліся каміны, некаторыя з іх будуць адноўлены. Плануецца, што ў адным крыле размесціцца элітны гатэль коштам за нумар ад 20 еўра і вышэй. На першым паверсе будуць бібліятэка, канферэнц-зала, іншыя памяшканні. У адным з іх на вялізным стале размешчаны макет маёнтка ў маштабе 1:250 і развешаны гербы радавітых сямействаў.

Асаблівасцю сядзібы стане стварэнне першага ў краіне музея беларускай шляхты. Гэту ідэю, дарэчы, прапанаваў расійскі бізнесмен, а паплечнік Андрэй Колас горача падтрымаў яго. Аматар даўніны прыносіць у будучы музей старажытныя кнігі XVII—XVIII стагоддзяў, запальвае свечкі і расказвае аб гісторыі шляхецкага роду турыстам, якія сюды заязджаюць.

— У палякаў такі музей ёсць, ва ўкраінцаў — музей казакоў, у расіян — баяр, а мы што, горшыя? У такіх маёнтках жыла наша беларуская шляхта. Дарэчы, недалёка, у Ружанах, жыў Леў Сапега, які напісаў Статут ВКЛ, — адзначае суразмоўнік.

Музей шляхты — не адзіная «фішка» сядзібы. Новыя гаспадары лічаць, што турыстаў зацікавіць постаць Напалеона, які, ёсць такая версія, спыняўся ў маёнтку. У Падароску нават высветлілі, у якім канкрэтна пакоі начаваў французскі палкаводец падчас кампаніі 1812 года. Тут размесціцца адпаведная экспазіцыя.

— Згодна з запісам — у самым дальнім левым пакоі, вось мы тут і знаходзімся. Я паглядзеў у інтэрнэце, як выглядаў ложак Напалеона. Гэта пакуль часовая прылада, каб проста было што паказаць. У мяне есць люстэрка старадаўняе, манекен Наполеона. Між іншым, у Ваўкавыску ваенныя дзеянні вяла другая армія Баграціёна, у райцэнтры ёсць адпаведны музей, — зазначае Андрэй Колас.

Трэба сказаць, што пры свечках маёнтак выглядае надзвычай таямнічым. А яны неабходны ў тых пакоях, дзе няма вокнаў. Гэтым у свой час скарысталіся кажаны, якія раз-пораз вылятаюць, каб схавацца ад святла. Іх тут налічылі больш за два дзясяткі.

Брама, якая вядзе ў турыстычны комплекс «Маёнтак «Падароск».

Маёнтак — частка кластара

На сядзібе будзе створаны турыстычна-рэкрэацыйны комплекс. Андрэй Колас з'яўляецца дырэктарам унітарнага прадпрыемства «Маёнтак «Падароск». Хоць да канца рэканструкцыі далёка, тут разважаюць аб тым, як развівацца ў будучым. Разглядаецца пытанне аб набыцці будынка былога пажарнага паста, у якім ёсць ідэя стварыць хостэл.

Дарэчы, сядзібны комплекс можа стаць адным са знакавых аб'ектаў новага кластара. Турыстычны маршрут будзе даволі цікавы, лічыць Андрэй Колас, бо пройдзе па тэрыторыі Белавежскай пушчы, на мяжы з якой знаходзіцца і сам маёнтак. Да таго ж у суседніх з Падароскам вёсках Ізабелін і Верусіно прыватныя гаспадары выкупляюць старажытную піваварню і сінагогу. Адноўленыя аб'екты стануць часткай новага кластара. Будуць задзейнічаны і аграсядзібы.

— Я сам гісторык, выкладаю спецыяльныя турыстычныя дысцыпліны у Ваўкавыскім каледжы, — расказвае Андрэй Колас, — у нас ёсць суполкі ў сацыяльных сетках, мы адкрытыя да грамадства і зацікаўлены, каб развіваць турызм.

Маргарыта УШКЕВІЧ

Фота слова

Нашы дзяды
майстрамі,
Пэўна, былі
ад Бога:
Камень
калолі рукамі,
Каб прыгажэла дарога.

Гэты сакрэт далёкі
Ведалі ўсе пакаленні:
Будзе дарога лёгкай —
Важкім брукуй
каменнем.

Мелі адну надзею
Тысячы стомленых
рук:
Будзе служыць
надзейна
Потам паліты брук.

Мне яна —
нібы спадчына,
Непадуладна гадам,
Дзе брукаванку
бачу я —
Дзякуй кажу дзядам.

«МАЛАДОСЦЬ»:
сустрэча стагоддзяў і культур

Жнівеньскі нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Маладосць», які днямі выйдзе з друку, паяднаў народы і культуры. І нават паяднаў розныя гістарычныя адрэзкі часу. На старонках выдання, выпуск якога прымеркаваны да Дня беларускага пісьменства, у перакладзе на беларускую мову змешчаны творы паэзіі і прозы з розных нацыянальных літаратур: Індыі, Бангладэш, Кітая, Кыргызстана, Расіі, Туркменістана, Таджыкістана...

Што прыкметна вылучае гэты «маладосцеўскі» нумар, дык гэта жаданне рэдакцыі і перакладчыкаў пашырыць прастору стасункаў беларускага слова з усім светам. Калі Рабіндраната Тагора ведаюць у Беларусі яшчэ з сярэдзіны 1920-х гадоў (першы перакладчык лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры, індыйскага класіка — народны пясняр Беларусі Якуб Колас), то адкрыццём з'яўляецца пераклад верша ці нават паэмы «Мяцежнік» Казі Назруло Іслама з Бангладэш. Максат Бяшымаў з Туркменістана з апавяданнем «Свята» — гэта магчымасць «зазірнуць» у маладую туркменскую прозу. Лаік Шэралі ў перакладах Навума Гальпяровіча прадстаўляе Таджыкістан. Уражальнай публікацыяй падаецца паэма башкірскай пісьменніцы Зульфіі Хананавай «Ачаг» (перакладчыца — Марыя Кобец). Анварбек Култаеў (яго знаёміць з беларускім чытачом Мікола Мятліцкі) расказвае ў вершах пра лёс нагайскага народа. Сам паэт жыве і працуе ў Дагестане, Махачкале. Расійскую Федэрацыю прадстаўляюць яшчэ і народны пісьменнік Татарстана Роберт Мінулін, малады рускі празаік з Масквы Алена Тулушава.

Выпуск перакладнога нумара часопіса «Маладосць» будзе прэзентаваны ў час правядзення міжнароднага круглага стала беларускіх і замежных пісьменнікаў, які пройдзе ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці літаральна ў пярэдадзень Дня беларускага пісьменства — 1 верасня.

Сяргей ШЫЧКО.

■ На экранах

КОСМАС У ГІПЕРМАРКЕЦЕ

Адна надзвычайная карціна ў мінскім пракаце

Ах, які пасаж. Дзеянне фестывальнага хіта «Між стэлажоў» адбываецца ў гіпермаркеце, галоўнымі героямі з'яўляюцца яго работнікі, у гэтых лакацыях узнікае пяшчотная закаханасць, але фільм з першых сцэн намякае, што гаворка тут ідзе пра што хочаце, толькі не пра краму. Праект «Лістапад. Калекцыя» паказвае ў Мінску намінанта на «Залатога мядзведзя» апошняга Берлінале ад рэжысёра Томаса Штубера. Яшчэ ў дні кінафестывалю карціна атрымала шмат увагі крытыкаў і дзве ўзнагароды, а зараз — у «Піянеры» і Falcon Club Буцік Кіно — паказвае, за што.

Усё пачынаецца са знаёмства. З гіпермаркетам, машынэрыяй, увасабленнем капіталізму, упарадкаванай сістэмай і яе стройнымі радамі. Трэвэлінгі пад вальс «На цудоўным блакітным Дунаі» Іагана Штрауса непасрэдна адсылаюць да маштабу фільма «Касмічная адысея 2001 года» Стэнлі Кубрыка. Там камера робіць гледача амаль бязважкім, надае адчуванне павольнага лунання ў атмасферы і паказвае зачаравальную галактыку. Тут мы з розных ракурсаў — зноў жа ў павольных рухах — аглядваем крамныя рады, і тады нам адкрываецца «космас».

Тое, што гіпермаркет — не проста гіпермаркет, арганічнымі дэталямі падкрэсліваецца на працягу ўсёй трагікамедыі. Аддзелы і войны паміж імі, Сібір і мора, розныя часавыя паясы, эскімосы, адпачынак на пляжы, піцейная ўстанова, упрыгожаны да Калядаў «горад», іншае-іншае і толькі сон за межамі гіпермаркета.

І вось у гэтых умовах — трэба мець на ўвазе, што крама ўвасабляе сучасную Германію, свет ці нават «космас» — развіваецца зусім няхітры сюжэт. У аддзел напояў прыходзіць маўклівы навічок Хрысціян (Франц Рагоўскі). Шэфства над ім бярэ Бруна (Петэр Курт), усё жыццё якога звязана з гіпермаркетам і тым, што на яго месцы было да падзення Берлінскай сцяны. Ужо хутка Хрысціян аказваецца закаханым у Марыён (Сандра Хюлер) з аддзела ласункаў, а глядач — захопленым пяшчотнай рамантычнай гісторыяй, усёй з няёмка-нявінных рухаў.

І ўсё ж рамантычная лінія, якая «рэкламуецца» ў анатацыі і з пераменнай інтэнсіўнасцю паказваецца ў фільме, тут не галоўная. Самае цікавае — сачыць за буднымі днямі гіпермаркета і яго супрацоўнікаў і знаходзіць у іх адсылкі да больш маштабных катэгорый. У гэтых маштабных катэгорый свая гісторыя: да падзення Берлінскай сцяны і пасля. Калі «пасля» ўвасабляецца ў нейкім капіталістычным сімвале — краме, то мінулае ўяўляецца дарогай (каманда супрацоўнікаў гіпермаркета да яго з'яўлення займалася дальнабоем).

Бруна, якому разам з Хрысціянам і Марыён прысвечаны цэлы раздзел фільма, сумуе па дарозе, праўда, пэўна, не таму, што яна адзначана дабрабытам, а таму, што ў мінулым заўсёды ёсць нешта, па чым можна сумаваць. Як казаў Кант, настальгуючы, мы сумуем на па мінулым, а па саміх сабе. Трагічная акалічнасць заключаецца ў тым, што мінулае і сучаснасць быццам два розныя сусветы. «Да падзення Берлінскай сцяны» і «пасля» значаць нейкія фатальныя перамены, таму не для ўсіх людзей старога свету знаходзіцца месца ў новым.

Кожны з трох галоўных герояў паказваецца ў тым ліку за межамі гіпермаркета, і гэтае «замежнае» жыццё нясе ў сабе знакі нейкай фіктыўнай рэальнасці. Хрысціян адкрыта кажа, што прамежак часу пасля працоўнай змены да наступлення новай быццам сон. Жыццё Бруна не такое, якім ён яго прадстаўляе, рэчаіснасць Марыён — не такая, якой яе прадстаўляюць іншыя. У чым таксама можна ўбачыць вялікія з'явы мінулага і сучаснасці.

Трэба сказаць, гэта надзвычай каштоўна для кіно — здолець расказаць пра краіну праз гісторыю закаханасці паміж супрацоўнікамі гіпермаркета. За ўсімі целарухамі, падзеямі, размовамі, звычкамі, дыспазіцыяй, нарэшце, за галоўнымі героямі надзвычай цікава назіраць, амаль не адарвацца. Маўклівы Хрысціян, пэўны ўзровень недагаворвання, эпізоды пад выдатную музычную падборку — тут усё робіць выгляд вялікага драматычнага кіно, хоць па сутнасці гісторыя расказвае пра некалькі работнікаў гіпермаркета і не змяшчае заліхвацкіх сюжэтных паваротаў.

У выніку ж «Між стэлажоў» — сапраўды вялікае драматычнае кіно. Аксамітныя пачуцці, класічная музыка і шум мора — лейтматыў, які абыгрываецца ў карціне надзвычайным чынам, — робяць спарадкаваныя рады нібыта халоднай і непрывабнай машынерыі цёплымі, вытанчанымі і важкімі.

Усё гэта заслугоўвае першачарговай увагі — гаворка пра вялікае праз суперпростае, удзел Сандры Хюлер (успомніце «Тоні Эрдмана» Марэн Адэ) і Франца Рагоўскага (перагледзьце яго танец у «Хэпі-эндзе» Міхаэля Ханэке), спалучэнне камедыі з трагедыяй. Хіт Берлінале «Між стэлажоў» ідзе ў пракаце да 15 жніўня.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.37	20.52	15.15
Віцебск —	5.22	20.47	15.25
Магілёў —	5.27	20.42	15.15
Гомель —	5.29	20.33	15.04
Гродна —	5.53	21.07	15.14
Брэст —	5.59	21.02	15.03

Месяц

Апошняя квадра
4 жніўня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Анфісы, Марфы, Клімента, Мікалая, Навума.*
К. *Ірыны, Клары, Тэрэзы, Эдзіты, Рамана, Рамульда.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

9 ЖНІЎНЯ

У краіне

1902 год — нарадзіўся (Расія) Панцеляймон Кандратавіч Панамарэнка, партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-лейтэнант. У 1938—1941 гадах — 1-ы сакратар ЦК КП(б) Б. У Вялікую Айчынную вайну — член ваенных саветаў Заходняга, Цэнтральнага, Бранскага франтоў. У 1942—1944 гадах — начальнік ЦШПР пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання. Адзін з распрацоўшчыкаў і кіраўнікоў аперацыі «рэйкавая вайна». У 1944—1948-м — Старшыня Савета Міністраў БССР. Пасля (у розныя гады) — сакратар ЦК ВКП (б), міністр нарыхтовак СССР, міністр культуры СССР, 1-ы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана. З 1955 года — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол СССР у ПНР, Індыі і Непале, у Нідэрландах. Памёр у 1984 годзе.

1944 год — у Мінску арганізаваны аўтазборачны завод (пазней на яго базе створаны Мінскі аўтамабільны завод — МАЗ).

1953 год — нарадзілася (г. Мінск) Інеса Мікалаеўна Слюнькова, беларускі і расійскі гісторык архітэктуры, доктар архітэктуры. Даследуе дойлідства і горадабудаўніцтва XIV—XIX стст. Аўтар кніг «Архітэктура гарадоў Верхняга Прыдняпроўя VII — сярэдзіны XIX ст.», «Манастыры ўсходняй і заходняй традыцыі: спадчына архітэктуры Беларусі».

У свеце

Міжнародны дзень карэнных народаў свету. Упершыню ўстаноўлены Генеральнай Асамблеяй ААН у рамках абвяшчэння 9 жніўня 1994 года. У свеце налічваецца каля 370 мільёнаў прадстаўнікоў карэнных народаў, якія жывуць у 90 краінах. Карэнныя народы з'яўляюцца носьбітамі 5 тысяч розных культур і пераважнай большасці сусветных моў, агульная колькасць якіх складае прыблізна 7 тысяч. Карэнныя народы з'яўляюцца носьбітамі ўнікальнай культуры і традыцый, атрыманых у спадчыну ад продкаў.

1893 год — нарадзілася Вера Васілеўна Халодная, руская актрыса перыяду нямога кіно, «зорка» рускага дарэвалюцыйнага экрана. У кіно здымалася з 1914 года. Іграла галоўным чынам у салонных драмах і меладрамах, ствараючы абаяльныя лірычныя вобразы прыгожай, сумнай, адзінокай жанчыны, ашуканай або незразумелай. Здымалася ў фільмах: «Міражы», «Маўчы, сум, маўчы», «Жывы труп», «Апошняе танга» і іншых. Памерла ў 1919 годзе.

1938 год — нарадзіўся Леанід Данілавіч Кучма, дзяржаўны і палітычны дзеяч Украіны, прэзідэнт Украіны (1994—2005).

1945 год — амерыканская авіяцыя падвергла атамнай бамбардзіроўцы японскі горад Нагасакі.

1945 год — пачалася Маньчжурская стратэгічная наступальная аперацыя савецкіх войскаў у ходзе Другой сусветнай вайны. Завяршылася 2 верасня.

УСМІХНЕМСЯ

— Як час ляціць, я ж памятаю іх яшчэ во-о-ось такенькімі!

— Гэта не час, гэта сілікон.

Каб пахудзець, мая сяброўка параіла выключыць з рацыёну мяса, пірожныя і алкаголь.

Вось сяджу пасля гэтага і думаю: а ці сяброўка яна мне?..

— Фімачка, ну што ты ўсё ныеш пра тую спадніцу? Ну, стала яна табе малая — дык выкінь яе к чортавай матары, калі яна тваю прыгажосць ужо не змяшчае!

«Перш папрацуй, а тады і патанцуй», — падумаў Пятровіч у дзве гадзіны ночы.

Адключыў перфаратар і ўключыў караоке.

— Добры дзень, мяне завуць Аліна.

— Вельмі прыемна!

— Гэта ненадоўга.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2982.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12